ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

# ДЗЕДЗІЧ

*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*

№ 1 (13)

ЛЮТЫ 2002

2 КАЛІ Ў БЕРАСЦІ БУДЗЕ ВУЛІЦА ІМЯ Т. КАСЦЮШКІ?

4 А ТЫ ДАСЛАЎ ВАЛЯНЦІНКУ?!

5 НОВЫ ПРАЕКТ «ДЗЕДЗІЧА» - ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

6 У БЕЛАРУСІ БУДЗЕ СВАЯ ПУСТЫНЯ! ЗАМЕСТ БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ

# АБЯЦАНКІ-ЦАЦАНКІ

## ЦІ «ЗНОЎ ПАДМАНУЛІ»

БЕЛАРУСЫ ПАЧЫНАЮЦЬ РАЗУМЕЦЬ, ШТО ІХ У ЧАРГОВЫ РАЗ «КІНУЛІ».




Фота: IREX/ProMedia

Прадстаўнікі Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ), Беларускай партыі працы правялі 31 студзеня ў парку Дружбы народаў у Менску пікет супраць парушэнняў уладамі сацыяльных правоў працоўных. Акцыя прайшла пад лозунгамі «Заробкі і пенсіі - на ўзровень цэн», «Дзе абяцаны заробак у 100 даляраў?».

Сапраўды, гледзячы на наша жыццё, разумееш, што большасць грамадзян Беларусі зноў лаханулась, паверыўшы ў чарговы раз хлуслівым абяцанням. А нам усім зараз трэба чакаць яшчэ 5 гадоў, каб атрымаць магчымасць змяніць сваё жыццё.

Калі дажывем. Хе-хе.

**Б. Дэпеша**




## ЛІДЗІЯ ЯРМОШЫНА: "УЖО СЁЛЕТА ПАЧНЕЦЦА НОВАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ – У МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ"



Як паведаміла 6 лютага старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына, ужо сёлета ў Беларусі зноў пачнецца выбарчая кампанія. Да 4 сакавіка 2003 г. павінны адбыцца выбары ў мясцовыя саветы, а ўказ пра прызначэнне даты выбараў Аляксандр Лукашэнка павінен падпісаць за тры месяцы да таго, то бок, да 4 снежня. Л.Ярмошына: "Я думаю, што гэта будзе альбо канец лістапада альбо пачатак снежня".

Спадарыня Ярмошына зазначыла, што мясцовыя выбарчыя камісіі мусяць быць сфармаваныя неўзабаве пасля выдання згаданага ўказу. Такім чынам, палітычным партыям ужо сёлета трэба прапанаваць мяцовым выканкамам кандыдатуры сваіх прадстаўнікоў. На леташніх прэзідэнцкіх выбарах шмат каму з апазіцыянераў адмовілі ў праве ўвайсці ў склад тэрытарыяльных выбарчых камісій.

Паводле Лідзіі Ярмошынай, чарговая кампанія будзе "не менш складанай, чым прэзідэнцкія выбары, а ў тэхнічна-арганізацыйным плане больш складанай". Трэба будзе абраць больш як 1600 мясцовых саветаў – ад абласных да сельскіх. На мінулых выбарах 1999 г. было створана каля 25 тысяч выбарчых акруг – прыблізна столькі ж будзе і дэпутатаў усіх узроўняў.

Замежных участкаў для галасавання не будзе, бо грамадзяне Беларусі са сталым месцам жыхарства за мяжой права выбіраць мясцовыя саветы не маюць. Затое такое права ёсць у грамадзян Расеі, якія стала жывуць у Беларусі.

Гэтым удзел расейцаў у беларускіх выбарах абмяжуецца. Хаця яшчэ нядаўна шмат казалі пра выбары ў гэтак званы саюзны парламент і рэферэндум пра Канстытуцыйны акт саюзнай дзяржавы. Старшыня Цэнтрвыбаркаму Лідзія Ярмошына на пытанне пра перспектывы гэтых двух галасаванняў адказала так:

"Не, гэтыя пытанні не абмяркоўваліся пакуль і не абмяркоўваюцца. Што да рэферэндуму, я думаю, што падобныя мерапрыемствы трэба праводзіць тады, калі грамадства саспела і патрабуе. Згаданыя мерапрыемствы, калі і будуць праводзіцца, дык тады, калі з'явіцца рэальная неабходнасць і калі гэта будзе асэнсавана не толькі ў Беларусі, а найперш у самым вялікім члене супольнасці – у Расейскай Федэрацыі".

Хаця яшчэ ўчора дэлегацыя АБСЕ на чале з Утай Цапф заклікала беларускія ўлады да зменаў у Выбарчым кодэксе, сёння Лідзія Ярмошына заявіла, што Выбарчы кодэкс цалкам адпавядае канвенцыі аб стандартах свабодных, справядлівых і дэмакратычных выбарах, і таму ён, паводле слоў Ярмошынай, не патрабуе дапрацоўкі.

**Паводле Радыё «Свабода»**

## АДНЫМ РАДКОМ

### ДЗЕЙНІЧАЕ МОЛАДЗЕВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЦЭНТР

З кастрычніка 2001 г. на базе "Дзедзіча" дзейнічае моладзевы інфармацыйны цэнтр, які аказвае інфармацыйныя, кансультатыўныя, адукацыйныя і тэхнічныя паслугі моладзевым арганізацыям і ініцыятыўным групам Берасцейшчыны. Там можна атрымаць кансультацыі па рэгістрацыі МА, па вёрстцы газет і бюлетэняў; інфармацыю аб конкурсах праектаў, адукацыйных праграмах, у якіх могуць браць удзел прадстаўнікі МА, кантакты ўсіх МА і ініцыятыўных груп Берасцейскай вобласці. Есць магчымасць карыстацца кампутарам, прынтарам, сканерам, запісваць інфармацыю на дыск, працаваць у Інтэрнэце. У Цэнтры праводзяцца працоўныя сустрэчы па актуальных праблемах дзейнасці МА.

**Dzedzich week-news**

### "ЖЫВАЯ ЗЯМЛЯ" АДНАЎЛЯЕ СВАЮ ДЗЕЙНАСЦЬ

Дзейнасць берасцейскай моладзевай ініцыятыўнай групы па стварэнні экалагічнага грамадскага аб'яднання "Жывая зямля" была спыненая паўтары гады таму. Тады кіраўніка групы Юрыя Кожухава адлічылі з БрДУ з-за "акадэмічнай запазычанасці" і прызвалі ў войска. Адразу па вяртанні ён сабраў сваіх старых паплечнікаў і плануе вярнуць з небыцця "Жывую зямлю". Як і раней, маладыя эколагі збіраюцца ў памяшканні Моладзевага цэнтра "Юнацтва" (вул. Ленінградская, 39. Тэл.: (0162) 42-51-45), дзе толькі што скончылі рамонт. Па словах Ю.Кожухава, галоўнай задачай "Жывая зямля" лічыць рэгістрацыю свайго аб'яднання, і на гэта зараз кінутыя ўсе намаганні кіраўніцтва клуба. Разам з тым ужо ў бліжэйшы час плануецца правесці шэраг мерапрыемстваў і акцый з мэтай прыцягнення ў свае шэрагі новай хвалі маладых берасцейцаў, неабыякавых да экалагічных праблем рэгіёна.

"Жывая зямля" зацікаўлена ў далучэнні да сваёй дзейнасці таксама і прафесійных эколагаў. Усіх зацікаўленых у ахове прыроды Берасцейшчыны маладыя эколагі чакаюць у сябе, а прапановы наконт супрацоўніцтва можна дасылаць на e-mail: alive_earth@mail.ru.

**Dzedzich week-news**

### "КОЛА" ВЫПУСЦІЛА НОВЫ АЛЬБОМ

Кола – берасцейскі музычны гурт, вядомы ў моладзевым асяроддзі. Група з 4 чалавек спявае аўтэнтычны фольк – беларускія народныя песні, а таксама песні ўласнага сачынення. Рухавіком усяго гурта з'яўляецца Алег Сцепанюк, з якім мы і паразмаўлялі наконт новага музычнага праекта.

"Шчодры вечар" – так называецца альбом, які ў хуткім часе выйдзе ў свет. Гэты альбом змяшчае беларускія народныя песні, але песні не тыя, якія мы прызвычаіліся слухаць. Як паведаміў нам Алег, словы да новых песень браліся ці ў старых беларускіх кнігах, ці запісваліся па вёсках са слоў старых бабулек. Не толькі вельмі цікавыя тэксты песень, але і выкананне а-капэла, г. зн. без музычнага суправаджэння. Адзінае, што спадарожнічае цудоўнаму вакалу выканаўцаў – мілагучная дудка ды звонкія бубны.

Яшчэ адна цікавая рэч: песні з'яўляюцца пасезоннымі. Доказам гэтага служаць загаворы паміж песнямі (калядкі, шчадроўкі). Ужо ў хуткім часе мы зможам самі ў гэтым пераканацца, калі запісаны альбом нарэшце будзе растыражаваны.

**Dzedzich week-news**

# БЕРАСЦЕЙЦЫ ВЕДАЮЦЬ СВАІХ ГЕРОЯЎ

4 лютага споўнілася 246 гадоў з дня нараджэння Тадэвуша Касцюшкі, нашага знакамітага земляка з-пад Косава (цяпер Івацэвіцкі р-н Берасцейскай вобл.). У 1794 годзе ён узначаліў паўстанне, накіраванае супраць расейскай палітыкі знішчэння Рэчы Паспалітай (федэрацыі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага). Як вядома, Тадэвуш Касцюшка з'яўляецца нацыянальным героем Польшчы і Амерыкі, ганаровым грамадзянінам Францыі. Помнікі Касцюшку ўстаноўлены ў Вашынгтоне, Чыкага (ЗША), Кракаве, Лодзі (Польшча), Салюры (Швейцарыя). На Беларусі існуе толькі адзіны помнік Касцюшку - у вёсцы Сяхновічы (Жабінкоўскі р-н).

Да дня нараджэння Т. Касцюшкі "Дзедзіч" прымеркаваў сацыялагічнае апытанне на вуліцах горада, каб высветліць стаўленне берасцейцаў да славутага сына беларускай зямлі. Па выніках апытання можна зрабіць выснову, што берасцейцы прынамсі ведаюць, хто такі Тадэвуш Касцюцка. Мінакам былі прапанаваныя тры пытанні: "Ці чулі Вы імя Тадэвуша Касцюшкі? ", "Вы ведаеце, чым стаў знакаміты гэты чалавек?", "Ці хацелі б Вы, каб у нашым горадзе адна з вуліц насіла яго імя?".

Усяго было апытана 70 чалавек, 79% з якіх ведаюць ці чулі імя Тадэвуша Касцюшкі. Дзедзічы атрымалі самыя разнастайныя адказы кшталту:



"Так, ведаю. Гэта знакаміты паэт. У дзяцінстве чытаў яго вершы", ці "А! Гэта Кастусь Каліноўскі?". Але знаходзіліся і такія, што распавядалі не толькі пра кіраўніцтва Касцюшкі паўстаннем, але і пра змаганне яго за незалежнасць ЗША.Іх, да гонару берасцейцаў, аказалася пераважная большасць.

За тое, каб імем Касцюшкі была названа адна з вуліц Берасця, выказалася 70% апытаных.

Адначасова дзедзічы раздавалі берасцейцам буклеты з кароткай інфармацыяй пра Тадэвуша Касцюшку.

**Dzedzich week-news**

### ПРАЦА Ў ДЗІЦЯЧЫХ ЛЕТНІКАХ

Рэспубліканская маладзёжная грамадская арганізацыя «Ліга добрахвотнай працы моладзі» фарміруе педагагічны атрад для працы ў дзіцячых летніках у Беларусі і Расіі (Краснадарскі край, Калініградская вобласць, Крым) улетку. Да ўдзельнікаў праграмы прад'яўляюцца наступныя патрабаванні: узрост не менш за 19 гадоў; жаданне працаваць у камандзе; адпаведная матывацыя; вітаецца вопыт працы і наяўнасць метадычных распрацовак; перавага аддаецца асобам, якія маюць педагагічную адукацыю. Набор удзельнікаў працягваецца да 17 лютага.

За больш падрабязнай інфармацыяй звяртайцеся: Мінск, вул. Б. Хмяльніцага, 4 (ст. м. «Акадэмія навук»), тэл. 284-08-81, Вольга.

### НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ МОЛАДЗЕВЫХ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ

На працягу 2002 года ў Пружанах, Лепелі, Мазыры, Ваўкавыску, Салігорску і Клімавічах будуць створаны новыя моладзевыя ініцыятывы. Іх стварэнне стане вынікам праекта «Парасткі», рэалізацыю якога пачала грамадская арганізацыя «Маладзёжны адукацыйны цэнтр «Фіяльта» пры падтрымцы фундацыі TACIC. Мэта праекта – падтрымаць дзейнасць моладзі ў малых гарадах Беларусі, а таксама даць магчымасць маладым людзям самарэалізавацца ў грамадскіх ініцыятывах. У кожным рэгіёне ў праекце прымуць удзел 30 маладых людзей ва ўзросце ад 16 да 23 гадоў - навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных установаў:Пружанскага аграрна-тэхнічнага каледжа, Лепельскага гідрамеліяратыўнага тэхнікума і інш. Праект уключае вялікую адукацыйную праграму, якая будзе складацца з трох этапаў: знаёмства з дзейнасцю НДА, лідэрства і пабудова каманды, вывучэнне юрыдычных асноваў дзейнасці і аспектаў аргразвіцця.

На трэцім этапе ўдзельнікі будуць планаваць дзейнасць сваіх ініцыятываў і працаваць з вонкавым акружэннем (грамадскасць, СМІ, дзяржаўныя стуктуры, іншыя НДА). На працягу ўсяго праекта ўдзельнікі змогуць атрымліваць кансультацыі юрыстаў НДА.

Ідэя праекта нарадзілася яшчэ ў 1997 годзе, калі НДА ўзнікалі і развіваліся ў вялікіх гарадах Беларусі. Праект «Парасткі» быў разлічаны на малыя гарады, у якіх НДА не было ўвогуле, але навучальныя ўстановы якіх налічвалі вялікую колькасць моладзі. Менавіта ў іх меркавалася збіраць актыўныя групы і ствараць ініцыятывы па абраных імі кірунках дзейнасці (рок-клуб, экалагічны форум і г.д.).

Усе, хто зацікавіўся праектам і хоча прыняць у ім удзел, могуць звязацца з «Фіяльтай» па адрасе: а/с 120, г. Мінск-29, 220029. Тэл./факс: + 375 172 22-78-73 (офіс «Фіяльты», Дзяніс Буткевіч). E-mail: fialta@user.unibel.by.

## АБ'ЯВЫ

### СТВАРАЕЦЦА БАЗА ДАДЗЕНЫХ БЕЛАРУСКІХ МУЗЫЧНЫХ ГУРТОЎ

З мэтай больш хуткай арганізацыі канцэртаў і шоу ствараецца база дадзеных беларускіх музычных гуртоў любых стыляў і колераў.

Калі ваша арганізацыя мае стасункі з музычнымі гуртамі вашага (і не толькі) рэгіёну, паведамце, калі ласка, наступную інфармацыю: назва гурта,музычны стыль, год заснавання, альбомы і запісы (калі ёсць), кантакты. Перавага аддаецца беларускамоўным гуртам.

Інфармацыю дасылайце e-mail: gurty@tut.by (Павал Красоўскі).

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**
**Рэдакцыя "ДЗЕДЗІЧА"**
**з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, які пабачыць свет у сярэдзіне сакавіка 2002 г.**
**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 26-15-51 да 25.02.02.**

# БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

## Ці ёсць перспектыва ў студэнтаў?

ДЗЯРЖАЎНАЯ (А КАЛІ ДАКЛАДНЕЙ – ПРЭЗІДЭНЦКАЯ) ПАЛІТЫКА НА БЕЛАРУСІ СЁННЯ ЯЎНА НЕ ПРАБЕЛАРУСКАЯ. І БЕЛАРУС, ЯКІ ВЕДАЕ СВАЮ МОВУ І РАЗМАЎЛЯЕ НА ЁЙ, ЗАРАЗ, ТАК БЫ МОВІЦЬ, "НЕ Ў ЦАНЕ". А ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА СЯРЭДНЕСТАТЫСТЫЧНАГА НАСТАЎНІКА СЁННЯ – 55 ДАЛЯРАЎ. АДНАК КАЛІДОРЫ ФІЛФАКА БрДУ ЗАПОЎНЕНЫ СТУДЭНТАМІ, БУДУЧЫМІ НАСТАЎНІКАМІ РОДНАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ. ЗАЛІКІ, КАЛОКВІУМЫ, СЕМІНАРЫ, – ЖЫЦЦЁ СТУДЭНТАЎ ІДЗЕ СВАІМ ЗВЫЧАЙНЫМ ХОДАМ. ЧАМУ?

У пошуках адказу на гэтае пытанне я звярнулася да саміх студэнтаў. Вынік – дзве цікавыя і карысныя размовы, два процілеглыя погляды і нездарма страчаны час.

Першы мой суразмоўца – **Сяржук Гаўрыленка**, студэнт 2 курса філалагічнага факультэта беларуска-польскага аддзялення. За шкельцамі акуляраў – цэпкі позірк цвярозага рэаліста. Другая – **Ганна Маршанюк**, калега Сяржука - на першы погляд падалася мне вельмі рамантычнай і ў той жа час мэтанакіраванай.

### ГЭТА ІХ ВЫБАР

*- Раскажы, як ты апынулася тут. Твой выбар быў асэнсаваны ці выпадковы? Што цябе прыцягнула?*

Г.М.: Безумоўна, выбар мой быў невыпадковы. Калі я была яшчэ вельмі маленькая, я любіла марыць пра тое, як у будучыні стану настаўнікам, буду хадзіць перад дзецьмі, што будуць паслухмяна і ціхутка, нібы мышы, сядзець за сваімі партамі, і тлумачыць ім незразумелыя, але цікавыя і захапляльныя рэчы, расказваць пра дзівосы Сусвету, разам з імі марыць пра далёкія падарожжы ў экзатычныя краіны, распавядаць пра Радзіму, выхоўваць сапраўдную сыноўнюю любоў да яе, чаго, на жаль, нам востра не хапае зараз. Пасля заканчэння школы прыйшла пара ажыццяўляць сваю блакітную мару. Дбайныя пошукі і прывялі мяне ў Берасцейскі універсітэт.

С.Г.: Мяне і гэты універсітэт, і абраная спецыяльнасць, і ўсе светлыя магчымасці, на якія, здаецца, шчодрая наша будучыня, увогуле анічым не прываблівають. У школе я быў аматарам фізікі і матэматыкі і апошнія два гады рыхтаваў сябе да эканамічнай сферы актыўнасці. Але жыццёвыя перыпетыі прымусілі падаць заяву на паступленне менавіта туды, дзе зараз і вучуся. Справа ў тым, што паступіць зараз на эканамічную ці якую іншую прэстыжную спецыяльнасць "простаму смяротнаму" амаль немагчыма. Паступленне post factum і хабарніцтва – вось што кіруе сёння справай.

### ІХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

*- А наколькі цікава вучыцца тут?*

Г.М.: На нашым філалагічным факультэце, на маю думку, і тут я не адзінокі, сканцэнтравана асноўная навуковая база, мабыць, усяе Беларусі. Кожная дысцыпліна, што выкладаецца са шчыраю ўдзячнасцю, прычым даволі часта, на жаль, не апраўданаю з боку студэнтаў, сама па сабе настолькі цікавая, што пры мінімальным унікненні ў яе наступае сапраўднае, непадробленае захапленне. Не хочацца нават пералічваць, ды і цяжка часамі вызначыць, якая дысцыпліна найлепшая за астатнія. Галоўнае, я лічу, што хоць калі-небудзь, хаця б раз у жыцці, але ўсе набытыя веды спатрэбяцца. Безумоўна, на думку некаторых студэнтаў, ёсць прадметы, не тое, каб некарысныя, але якія проста тлумяць галаву, адбіваючы падчас ахвоту ўвогуле вучыцца далей. І таму студэнцтва наўрад ці выказалася б станоўча пры вырашэнні пытання, ці вывучаць такія дысцыпліны далей.

*- А што выкладаюць на польскім аддзяленні, ці ёсць магчымасць выехаць на практыку ў Польшчу?*

С.Г.: Па польскай спецыяльнасці нам выкладаюць зараз непасрэдна польскую мову і гісторыю Польшчы. Па-за намі ўжо польская дзіцячая літаратура і польскі фальклёр. А ў будучым нас яшчэ чакае польская літаратура і шмат чаго іншага. Магу вас запэўніць, што гэта вельмі цікава. А дзеля паляпшэння моўнага ўзроўню нам прадастаўлена магчымасць выехаць на практыку. Але з сумам трэба сказаць, што з кожным годам колькасць месцаў для нашых студэнтаў скарачаецца. У гэтым годзе, пасля першага курса некалькі студэнтаў, сярод якіх быў і я, пабывалі за заходняй мяжой і вярнуліся адтуль з вялікім багажом ведаў.

Г.М.: На нашай беларуска-польскай спецыяльнасці выкладаецца цэлы шэраг польскіх прадметаў, якія, безумоўна, пашыраць нашыя магчымасці ў будучым. Гэта рэальная перспектыва працаваць настаўнікам беларускай і польскай моў адначасова. Іншая справа, што такіх школаў, дзе вывучаюцца абедзве гэтыя мовы, не так ужо і шмат. На моўную практыку магчымасць выехаць тэарэтычна ёсць, але на практыцы... Вельмі ўжо мала месцаў. Я, напрыклад, у мінулым годзе ў Польшчу не трапіла, хоць па польскай мове мела выдатную адзнаку, што было адзінай неабходнай умовай. Таму ўсё не так добра, як хацелася б.

### І ІХ БУДУЧЫНЯ...

*- Якой табе ўяўляецца твая будучыня? Як лічыш, ці ёсць у цябе перспектыва ў сённяшняй Беларусі?*

С.Г. А вось тут трэба адказаць сапраўды шчыра: не. Ніяк не бачу сваю будучыню. Цёмна ўсё навокал. Краем кіруе змрок. Прасвету няма аніякага. Далейшая будучыня ў школе здаецца адэкватнай калі не павольнай смерці, дык атуплення, бяссілля, нуды. Маладыя настаўнікі гандлююць на рынку. Гэта сённяшняя беларуская рэальнасць. Сумна, але факт: людзям, ад якіх залежыць наша будучыня, няма на што жыць. Нацыя памірае, і найперш гэта адчувае настаўнік роднай мовы. Па словах мужыцкага адваката і пісьменніка Францішка Багушэвіча, чалавеку перад смерцю займае мову. Мы ўжо – нямыя, сапраўдныя нямкі і манкурты. Ці здолеем аднавіць былую магутнасць Радзімы – невядома.

Г.М.: Калі паступала ва універсітэт, дык адразу ведала – пайду працаваць настаўнікам. Адчуваю, што гэта мая стыхія, дзе я змагу самарэалізавацца. Я полька, але вельмі люблю беларускую мову і хачу, каб яе любілі таксама дзеткі. Яны – заўтрашняя Беларусь. Безумоўна, сённяшнія абставіны з настаўніцкай працай не вельмі абнадзейваюць. Але куды дзенешся? Некаму ж трэба навучаць дзяцей. Наконт перспектывы... Яна ёсць. Не самая лепшая, але ўсё ж такі. Мы ўсе зараз жывем спадзяваннямі на змены ў нашым грамадстве: палітычныя, эканамічныя. Трэба верыць у лепшае, рабіць усё дзеля нашай будучыні – і яна абавязкова наступіць! Я, прынамсі, веру ў гэта.

**Алена Дземідзюк**

## АДНЫМ РАДКОМ

### КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ПАШТОЎКУ

Добраахвотніцкі Цэнтр роўнага навучання «Роўны навучае роўнага» аб'яўляе конкурсы: «Лепшы макет паштоўкі па тэме ВІЧ/СНІД», «Самы цікавы дэвіз па тэме ВІЧ/СНІД».

У конкурсах могуць браць удзел маладыя людзі ва ўзросце ад 14 да 22 гадоў. Макеты паштовак і дэвізы неабходна прадставіць да 29 сакавіка 2002 года. Пераможцаў чакаюць цікавыя прызы.

Цэнтр «Роўны навучае роўнага» быў адкрыты ў рамках праекта па стварэнню беларускай сеткі добраахвотніцкіх Цэнтраў роўнага навучання, які рэалізуе грамадская арганізацыя «Маладзёжны адукацыйны цэнтр «Фіяльта» пры падтрымцы прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ) у Беларусі. Мэтай стварэння Цэнтра стала развіццё сярод навучэнцаў Менска добраахвотніцкіх ініцыятываў, звязаных з прапагандай здаровага ладу жыцця сярод равеснікаў, а таксама прадастаўленне ім неабходнай і своечасовай інфармацыі па пытаннях ВІЧ/СНІД. У рамках гэтай дзейнасці праводзяцца асветніцкія семінары ў навучальных установах Менска, Горадні, Гомеля, Берасця, Віцебска, Магілёва, маладзёжныя акцыі і інфармацыйныя кампаніі па праблемах ВІЧ/СНІД.

Усе, хто зацікавіўся конкурсамі і хоча ўзяць у іх удзел, могуць звязацца з «Фіяльтай» па адрасе: а/с 120, г. Мінск-29, 220029. Фіяльта. Тэл./факс: + 375 172 22-78-73. E-mail: fialta@user.unibel.by.

Альбо звяртайцеся ў "Дзедзіч", на базе якога дзейнічае гарадскі Цэнтр роўнага навучання.

**Dzedzich week-news**



**Маладосці ўласцівы аптымізм**

**Фота: IREX/ProMedia**

# Святы ВАЛЯНЦІН – АБАРОНЦА ЎСІХ ЗАКАХАНЫХ

ДЗЕНЬ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА ЯК СВЯТА ЗАКАХАНЫХ АДЗНАЧАЕЦЦА 14 ЛЮТАГА Ў ЕЎРОПЕ З XIII СТ., У ЗША – З 1777 ГОДА, У КРАІНАХ СНД (АДКРЫТА) – З ПАЧАТКУ 90-Х ГАДОЎ XX СТ.




Цікавае паходжанне свята. Аб жыцці рэальнага хрысціяніна Валянціна амаль нічога не вядома. Нарадзіўся ён у III ст. н.э. у горадзе Церні (Рымская імперыя). Дробныя факты трагічнага лёсу вядомыя з пярэчлівых паданняў. Расказваюць, што цернскі епіскап яшчэ маладым чалавекам дапамагаў маладым закаханым пісаць лісты з прызнаннямі, мірыў іх, дарыў кветкі маладым. Арышт яго быў звязаны быццам бы з тым, што рымскі імператар Юлій Клаўдзій II не дазваляў салдатам імперскіх легіёнаў браць шлюб, а Валянцін употай вянчаў легіянераў.

Калі Валянцін сядзеў за кратамі, ён закахаўся ў сляпую дачку свайго турэмнага наглядальніка – і вылечыў яе. Кажуць, праўда, што падзеі развіваліся наступным чынам: наглядальнік папрасіў Валянціна вылечыць яго дачку, а тая закахалася ў непажаданага ўладам святара. Перад пакараннем смерцю ён пакінуў ёй развітальную запіску і падпісаўся: “Твой Валянцін”. Адсюль і паштоўкі “валянцінкі”. Шырока распаўсюдзіліся яны толькі ў XIX ст. Дата пакарання св. Валянціна супала з рымскімі ўрачыстасцямі ў гонар Юноны, багіні кахання. Гэты дзень у Рыме лічылі пачаткам вясны.

Сёння святкаванне Дня ўсіх закаханых вырвалася далёка за рамкі каталіцкага і стала самай што ні ёсць масавай, самай любімай у шматлікіх народаў урачыстасцю.

Усіх святочных вар’яцтваў, якія чыняць зусім дарослыя людзі ў Дзень св. Валянціна, пералічыць немагчыма. Што там паштоўкі ў выглядзе сэрцаў! Што там цукеркі, парфумы і кветкі! Што каштоўнасці, як прынята ў Францыі! Ці здатная, напрыклад, “жалезная ледзі” Амерыкі, дзяржсакратар Мадлен Олбрайт абыходзіць удзельнікаў паседжання Савета Бяспекі ААН, адорваючы кожнага прыгожым падарункам з цукеркамі? Здатная – у Дзень св. Валянціна. Ці здатныя лютыя перуанскія тэрарысты прапускаць да сваіх заложнікаў пасрэднікаў з шакаладкамі і кампакт-дыскамі? Безумоўна! Так было ў Дзень св. Валянціна.

Класічнай эмблемай Валянцінава дня лічацца чырвоныя ружы, якія, згодна антычнага падання, з’явіліся дзякуючы грэцкай багіне кахання і прыгажосці: Афрадыта, спяшаючыся да свайго каханага Адоніса, наступіла на куст белых ружаў, і яе божая кроў пафарбавала іх у чырвоны колер.

14 лютага – дзень павышэння вытворчасці працы супрацоўнікаў пошты і дзень звышпрыбыткаў гандляроў кветкамі і сувенірамі. У ЗША ў мінулым годзе ў гэты дзень куплялі 24 тысячы ружаў у хвіліну. Лік электронных пасланняў у Internet 14 лютага ідзе на мільёны.

Значная частка “валянцінак” ананімная, не мае адваротнага адраса, напісаная справа налева і левай рукой. Так прынята – гэта дадае загадкавасці. У Англіі пасля 14 лютага прыватных дэтэктываў завальваюць замовамі на вызначэнне асобы адпраўнікоў. Японцы ж аказаліся больш арыгінальныя – яны перарабілі 14 лютага ў своеасаблівае “8 сакавіка для мужчын”, калі падарункі атрымлівае ў асноўным моцны пол.

У наш час валянцінкай называюць паштоўку каханаму на Дзень св. Валянціна. Першыя пісьмовыя валянцінкі з’явіліся яшчэ ў XV ст. Самая старадаўняя з іх, датаваная, як мяркуецца, XVст., выстаўлена ў якасці экспанату ў Брытанскім музеі. Папяровымі валянцінкамі раней абменьваліся замест падарункаў. Асаблівую папулярнасць яны набылі ў Англіі. Іх рабілі з каляровай паперы і падпісвалі каляровымі чарнiламі. Вынаходніцтва закаханых у стварэнні валянцінак не ведала межаў. Самыя таленавітыя пісалі валянцінкі ў выглядзе акраверша (гэта вершаваны памер, калі першыя літары кожнага радка складаюць разам сэнсавае слова, у дадзеным выпадку – імя каханага ці каханай). Валянцінкі выразалі маленькімі нажнічкамі альбо пракалвалі англійскімі шпількамі ў выглядзе карункаў, афарбоўвалі з дапамогай трафарэту, стваралі валянцінку-паззл альбо рэбус ці імітавалі сярэдневяковы рукапіс з каляровымі малюнкамі. У пачатку XIX ст. пачалася серыйная вытворчасць валянцінак. Спачатку гэта былі чорна-белыя малюнкі, намаляваныя ад рукі. Сучасныя закаханыя часцей віншуюць адзін аднаго віртуальнымі валянцінкамі.

**Алена Дземідзюк**



**14 лютага 2000 г. у спорткомплексе Уруч‘е адбыўся масавы пацалунак каля 4-х тыс. пар, якія прэтэндавалі на занясенне ў Кнігу рэкордаў Гінэса. Папярэдні рэкорд, устаноўлены амерыканскімі студэнтамі - 1300 пар.**

**Фота: IREX/ProMedia**

---

**ЗАСПЯВАЕМ!**

МЫ ПРАЦЯГВАЕМ ПУБЛІКАВАЦЬ ТЭКСТЫ НАЙБОЛЬШ ПАПУЛЯРНЫХ БЕЛАРУСКІХ ПЕСЕНЬ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЛЮБІЦЬ АДПАЧЫВАЦЬ З ПЕСНЯМІ ПАД ГІТАРУ І ХАЦЕЎ БЫ СПЯВАЦЬ БЕЛАРУСКІЯ ПЕСНІ.

*Кася Камоцкая*

## МАЯ КРАІНА

Am F
Я люблю, калі сьвеціць сонца
Dm E
Рана ранкам праз фіранкі
Я люблю пах сьвежае кавы
Я люблю пах смажанай бульбы
Мне падабаецца дым цыгарэтаў
Мне падабаецца водар парфумы
Я люблю халодныя блюзы
Я люблю свае джынсы старыя
Я жыву ў гэтай Краіне
Мая Краіна пад белым сьнегам
Мая Краіна пад белым сьцягам
Пад белым сьцягам з чырвонай стужкай
Я зь цягам часу стануся птушкай
Раскіну крылы, зраблю тры крокі
І падымуся па-над зямлёю
Туды, дзе вецер і дзе аблокі
Над Краінай пад белым сьнегам
Над Краінай пад белым сьцягам
Пад белым сьцягам з чырвоной стужкай
Мая свабода
Мая свабода - зь ветрам нязгода
Ды асалода супрацьстаяньня
Мая свабода - човен падводны
Паміж Сцылаю ды Харыбдай
Мая свабода - дом папяровы
Паміж Гамораю ды Садомам
А там за домам край невядомы
Пад белым сьнегам пад белым сьцягам
Зь цягам часу складанымі сталі
Законы гульні
А неяк раней усё проста было
І мы былі;
Мы проста ішлі мы проста стаялі
Мы проста жылі і паміралі
У сваіх дамох папяровых
У сваіх падводных чоўнах
Паміж Сцылаю ды Харыбдай
Паміж Гамораю ды Садомам
Паміж Сцылаю ды Харыбдай
Паміж Гамораю ды Садомам
У Краіне пад белым сьнегам
У Краіне пад белым сьцягам
У Краіне пад белым сьнегам
У Краіне пад белым сьцягам
Пад белым сьцягам
з чырвонай стужкай
Мая свабода...

www.bma.home.by

*Ад прадзедаў, спакон вякоў... (Я. Купала)*

ЗАНЯДБАНАЯ СПАДЧЫНА

# ХТО ВЫРАТУЕ ПАЛАЦ У КОСАВА?

МНОГІЯ З МАІХ ЗНАЁМЫХ НА ПРАПАНОВУ АДРЭСТАЎРАВАЦЬ ПАЛАЦ У КОСАВА АДКАЗАЛІ НЕШТА НАКШТАЛТ: "ТЫ ШТО, З ГЛУЗДУ З'ЕХАЎ?! ТАМ ЖА СТРАЛЯЮЦЬ!"

Наяўнасць галавы на плячах я даказваў каля мапы Беларусі. Косава – беларускі горад, які знаходзіцца ў Івацэвіцкім раёне, вайны там няма. Цудоўны палац у псеўдагатычным стылі – быў. Руіны палаца – ёсць. Напаўразбураныя сцены палаца стаяць за тры кіламетры ад горада, сярод былога парку. Дрэвы растуць з цэглы. Дажджы і грунтовыя воды вымываюць з падмурку і кладкі апошнія згусткі цэменту. Палацавая цэгла становіцца здабычай мясцовых жыхароў. Не гінуць жа дабру, мяркуюць яны. Аб тым, што палац знаходзіцца пад аховай дзяржавы, ніхто нават не здагадваецца. Гадоў праз дзесяць ад палаца нічога не застанецца, і неабходнасць абараняць яго знікне сама сабою.

У ідэале Косаўскі палац патрэбна аднавіць, стварыць у горадзе турыстычную інфраструктуру і зарабляць грошы. Косава знаходзіцца ўсяго за пятнаццаць кіламетраў ад галоўнай транспартнай артэрыі краіны і мае ўсе шансы стаць турыстычным цэнтрам. Там ёсць на што паглядзець: дзве царквы XVIII і XIX стагоддзяў, каталіцкія каплічкі, дом даваеннай пабудовы, палац. Але ў першую чаргу ў Косава пацягнуліся б турысты з Польшчы, Францыі і ЗША, бо там нарадзіўся Касцюшка, нацыянальны герой гэтых краін. У Косава знаходзілася сядзіба Касцюшкаў (яна разбурана поўнасцю), а ў касцёле, адбудаваным на месцы старога, захавалася хрысцільня тых часоў. Ці Косава чымнебудзь горш за Навагрудак, радзіму іншага нашага славутага земляка – Адама Міцкевіча? Але Навагрудак не сорамна турыстам паказаць, а Косава – сорамна.

Палац – сымбаль горада, змешчаны на яго гербе, - мог бы стаць галоўным здабыткам Косава. ¨н пабудаваны ў 1838 годзе па замове буйнога прадпрымальніка Вандоліна Пуслоўскага, сям'я якога валодала мястэчкам з канца XVIII ст. Варшаўскі архітэктар Францішак Яшэлда карыстаўся сярэднявечнымі ідэямі, таму палац будавалі як сапраўдны замак: сабралі навакольных сялян і прымусілі іх капаць равы і будаваць сцены, якія можна бачыць і зараз. Кіруючыся старадаўнімі рэцэптамі, у раствор для трываласці падмешвалі курыныя яйкі. Можа, дзякуючы гэтаму, пабудова і не разбурылася дашчэнту, хаця лёс у Косаўскага палаца быў незайздросны. Пасля паўстання 1863-1864 гг. палац перайшоў ва ўласнасць да расейскіх памешчыкаў, якія не маглі ўтрымліваць такую вялікую маёмасць і прадавалі яе адзін аднаму.



Палякі ў 1920-я гады размясцілі ў палацы шпіталь.

У час вайны косаўскі палац згарэў. Ходзяць чуткі, што спалілі яго не адступаючыя немцы, а мясцовыя партызаны. Справа ў тым, што да вайны існаваў праект пераўпарадкавання палаца ў элітны санаторый. Вядома, што жыхарам Косава перспектыва быць выселенымі за лінію бяспекі маскоўскіх шышак не падабалася, але за пратэсты ў той час ставілі да сценкі. А вайна – час, калі ўсё можна было зваліць на фашысцкую гадзіну! Няма палаца – няма і санаторыя.

У сярэдзіне 70-х была прадпрынята няўдалая спроба рэстаўрацыі, пасля якой пачалося імклівае разбурэнне палаца. Былі раскапаныя сутарэнні, з-за чаго ў будынак пачалі трапляць грунтовыя воды, пачаў крышыцца цэмент. Тады ж абваліліся апошнія перакрыцці. Акрамя таго, кінуты, нікому не патрэбны палац пакутуе ад чалавечай абыякавасці. Становіцца балюча ад адзінага погляду на яго размаляваныя наведвальнікамі сцены, на раскіданае па ўсёй яго плошчы смецце і фекаліі. Людзі з гонарам выпаражняюцца на нашую гісторыю, атрымліваюць ад гэтага задавальненне. І застаюцца непакараныя.

Дрэнны стан косаўскага палаца бянтэжыць многіх і ў Міністэрстве культуры, і сярод простых смяротных. Але пакуль што няма каму нават сабраць і вывезці смецце за межы палаца. Урэшце ратаваць палац вырашылі студэнты гістфака БДУ. Мэта задуманай імі акцыі – засяродзіць увагу грамадскасці на крытычным стане каменнага пояса Беларусі – дзесяткаў замкаў, стагоддзяў нашай гісторыі. І, канешне, дапамагчы палацу ў Косава. Акцыя не мае ніякага палітычнага падтэксту, але, на ўсялякі выпадак, яе вырашана правесці не спякотным перадвыбарчым летам, а ў канцы верасня. Запланаванае спачатку як суботнік у лепшых традыцыях камсамольскай тусоўкі, мерапрыемства па выратаванні палаца ператварылася ў фестываль беларускай гісторыі і культуры. Была распрацавана праграма плэнера фатографаў і мастакоў, ёсць задумкі рыцарскага турніру, акустычнага канцэрту маладых беларускіх рок- і фолькгруп. Ініцыятыву студэнтаў падтрымалі ў камітэце па рэстаўрацыі і кансервацыі міністэрства культуры, у некаторых гуманітарных арганізацыях.

**Мікалай Карнейчукоў**

**(фота: Dzedzich week-news)**

ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

# ЛЮТЫ: ПАЭЗІЯ СВАБОДЫ

ШАНОЎНЫ СЯБАР! НОВАЯ РУБРЫКА «ДЗЕДЗІЧА» - «ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР» - БУДЗЕ РАСПАВЯДАЦЬ, ЧЫМ ЗНАКАМІТЫ ТОЙ ЦІ ІНШЫ ДЗЕНЬ У БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ. СПАДЗЯЕМСЯ, ШТО ТЫ ЗНОЙДЗЕШ ТУТ ШМАТ КАРЫСНАГА І ЦІКАВАГА. ЗАПРАШАЕМ АМАТАРАЎ ГІСТОРЫІ ЎЗЯЦЬ УДЗЕЛ У РАСПРАЦОЎЦЫ НОВАГА ПРАЕКТА - НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА КАЛЕНДАРА - ПРЫНОСЬЦЕ ЦІ ДАСЫЛАЙЦЕ ІНФАРМАЦЫЮ АБ ВЫБІТНЫХ ДЗЕЯЧАХ НАШАЙ РАДЗІМЫ.

## 1 ЛЮТАГА

1 лютага 1863 г. — пачатак антырасейскага паўстання, якое шырока вядома як **паўстанне Каліноўскага**. Літоўскі правінцыйны камітэт абвясціў сябе Часовым урадам на акупаваных Масквой землях Беларусі і Літвы. Быў прыняты маніфест аб пачатку паўстання і надзяленні сялян зямлёю.

1 лютага 1913 г. нарадзіўся **Сяргей Прытыцкі**. Яго імя варта згадаць хоць бы ўжо таму, што ім названы вуліцы ці не ў кожным заходнебеларускім горадзе і мястэчке. Савецкая прапаганда рабіла з Прытыцкага вобраз гэткага рамантычнага героя-падпольшчыка ў міжваеннай Заходняй Беларусі. Гэта ён проста ў залі Віленскага суда расстраляў сведку на працэсе Грамады. Пасля быў прысуджаны да смяротнага пакарання, але, як кажуць, пад націскам сусветнай грамадзкасці прысуд быў заменены на турэмнае зняволенне. Пасля вайны Прытыцкі займаў у БССР высокія партыйныя пасады. Пра яго геройствы нават знялі фільм "Чырвонае лісце".

**(працяг на с.8)**

*І нівы ваксросшыя закаласяцца... (М. Танк)*

# НІШЧАЦЬ

## НЕКРАНУТАЯ ПРЫРОДА ЯК СРОДАК ПАПАЎНЕННЯ БЮДЖЭТА

БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА, НАЙСТАРЭЙШЫ ЗАПАВЕДНІК ЕЎРОПЫ, - ГЭТА СТАРАЖЫТНЫ ПРЫРОДНЫ ПАРК З ПРАКАВЕТНЫМІ ДРЭВАМІ: ТУТ ЗАХАВАЛІСЯ ПЯЦІСОТГАДОВЫЯ ДУБЫ ДЫЯМЕТРАМ ДА ДВУХ МЕТРАЎ, ТРОХСОТГАДОВЫЯ ХВОІ ВЫШЫНЁЮ 50 МЕТРАЎ. ПУШЧА - ГЭТА НЕПАЎТОРНАЯ ЭКАСІСТЭМА. ПУШЧА - ГЭТА ЎНІКАЛЬНАЯ НАВУКОВАЯ БАЗА ДЛЯ БІЁЛАГАЎ, ЭКОЛАГАЎ. ГЭТА МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ.



Саджанцы сасны. Які лёс чакае іх? Фота: IREX/ProMedia

У мінулыя часы Белавежская пушча была паляўнічай гаспадаркай вялікіх князёў літоўскіх, польскіх каралёў, расейскіх цароў і савецкага Палітбюро. Гэта нацыянальная годнасць Беларусі і сымбаль нашай краіны. Менавіта з Белавежскай пушчы, з урадавай рэзідэнцыі Віскулі пачаўся адлік новай эры - распаду СССР і стварэння маладых незалежных дзяржаў.

Пушча лічыцца Нацыянальным паркам, але дагэтуль статусу Нацыянальнага парку няма. ¨сць інструкцыя, зацверджаная Берасцейскім аблвыканкамам. Паводле гэтай інструкцыі, Нацыянальны парк павінен выконваць сем наступных задач: ахова прыроды, захаванне біялягічнай разнастайнасці, правядзенне навуковых даследаванняў, маніторынг, развіццё турызму, экалагічная адукацыя і самае апошняе - гаспадарчая дзейнасць, якая не супярэчыць прынцыпам аховы прыроды.

Пяць гадоў таму ўнікальны прыродны запаведнік «Белавежская пушча» атрымаў адмысловы дыплом Рады Еўропы, і выкананне яго ўмоў і рэкамендацый мусіла стаць важнай праверкай адпаведнасці ўзнагароджанага аб'екту прынцыпам прыродазахавання. На думку беларускіх эколагаў, навукоўцаў, палітыкаў, рэкамендацыі дыплому не выконваліся, стан пушчы значна пагоршыўся - замест прыродаахоўных мерапрыемстваў там вядуцца прамыслова-гаспадарчыя работы.



Дрэвы цягнуцца да сонца. Заўтра цягнуцца будуць толькі пні. Фота: IREX/ProMedia

Галоўны рэдактар газеты «Белавежская пушча» Валерый Дранчук:

- Наведваючы пушчу цягам апошніх пяці гадоў, у перыяд дзеяння гэтага дыплому Рады Еўропы, мне якраз было бачна: тэндэнцыя ідзе да нарошчвання менавіта гаспадарчага патэнцыялу, гаспадарчых механізмаў. Гэта супярэчыць не толькі ўмовам і рэкамендацыям еўрапейскага дыплому, але і нават нашаму заканадаўству. Белавежская пушча - не звычайны лес, не лесгас, а Нацыянальны парк. Гэта наша ахоўная тэрыторыя.

Сітуацыя ў Белавежскай пушчы значна пагоршылася ў 2001 г., калі на ахоўнай тэрыторыі актывізаваліся нарыхтоўкі жывога лесу, пачаліся вялікія так званыя «санітарныя высечкі».

Натуральна, Белавежская пушча - гэта вялікая лясная гаспадарка, якая павінна быць рэнтабельнай і прыносіць прыбыткі. Але цяпер пушча перажывае не найлепшыя свае часы. Не хапае сродкаў на навуковыя даследаванні, на падтрыманне экалагічнага балансу. Змяняюцца кіраўнікі, звальняюцца навукоўцы, вырубаюцца ўнікальныя расліны пад прыкрыццём санітарных высечак лесу.

Адлік пушчанскіх праблем трэба пачынаць з былога дырэктара запаведніка Васіля Жукава. На яго ўсклалі задачу забяспечыць эканамічную стабільнасць і прыбытковасць Нацыянальнага парку. Для гэтага ён набыў тартак (лесапільню). З гэтаю мэтаю спадар Жукаў узяў валютны крэдыт, які перайшоў у спадчыну ягоным пераемнікам.

Праз некаторы час Упраўленне справамі Адміністрацыі прэзідэнта прызначыла дырэктарам Яўгена Смактуновіча. Сп. Смактуновіч - пушчанец у трэцім калене: тут працавалі і яго дзед, і бацька. Сам Яўген Смактуновіч вырас у Пушчы, працаваў навуковым супрацоўнікам, а перад прызначэннем на пасаду дырэктара 3 гады быў галоўным ляснічым. На жаль, спадар Смактуновіч ачольваў пушчанскую адміністрацыю менш за паўгады. Пасля таго, як ён прапанаваў выключыць з гаспадаркі тартак, ва Упраўленні справамі палічылі, відаць, што з такім дырэктарам пушча прыбытку не пабачыць. Менавіта таму замест Смактуновіча прызначылі Мікалая Бамбізу, шэраговага навукоўца, але выбітнага гаспадара, які праявіў свае здольнасці яшчэ ў Прыпяцкім Нацыянальным запаведніку, дзе таксама ачольваў адміністрацыю. Ужо тады ён атрымаў сумную вядомасць сярод незалежных эколагаў дзякуючы так званым «санітарным» высечкам лесу.

У хуткім часе пасля змены кіраўніцтва пушчу наведала камісія, у склад якой увайшлі прадстаўнікі Міністэрства лясной гаспадаркі і Упраўлення справамі Адміністрацыі прэзідэнта. Камісія даследавала некалькі лясных кварталаў, дзе растуць векавыя яліны, і выявіла, што дрэвы стачыў шашаль-тапограф. Паводле рашэння камісіі, сточаны лес падлягаў знішчэнню. Аднак некаторыя супрацоўнікі запаведніку вырашылі, што навала шашаля - вельмі зручная нагода для таго, каб запусціць тартак і разлічыцца нарэшце за валютны крэдыт. Пачалі біць у званы навукоўцы і зялёныя. Некалькі недзяржаўных выданняў надрукавалі зварот у абарону пушчы. Вынікам стала стварэнне новай камісіі, у склад якой увайшлі адмыслоўцы Нацыянальнай Акадэміі навук і супрацоўнікі Нацыянальнага парку.

Тады і высветлілася, што высечка лесу пачалася яшчэ да афіцыйнага дазволу з Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Высечку часова спынілі, але вельмі хутка аднавілі, і зараз працягваюць зноў. Адміністрацыя Пушчы па-ранейшаму цвердзіць, што гэта высечка з'яўляецца санітарнай. Аднак шмат эколагаў называюць яе прамысловай з-за тых буйных маштабаў, якія яна атрымала апошнім часам.

## АБ'ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня "Дзедзіч" шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах Берасця і вобласці. Тэл. (0162) 26-15-51.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці. Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце: (0162) 26-15-51**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**

**У Мерачоўшчыне (Івацэвіцкі р-н), недалёка ад Касаўскага палаца, у 2002 г. будуць праводзіцца работы па аднаўленні сядзібы Тадэвуша Касцюшкі. Будзе арганізаваны летні лагер для валанцёраў, жадаючых прыняць удзел у аднаўленні гістарычнага помніка.**

АБВЯШЧАЕМ НАБОР ВАЛАНЦЁРАЎ

у летні лагер у Мерачоўшчыне.

**Калі вас зацікавіла наша прапанова і вы маеце вольны час у жніўні, звяртайцеся да нас. Тэл.: (0162) 26-15-51.**

# БЕЛАВЕЖСКУЮ ПУШЧУ



Хто той шашаль, што стачыў нацыянальнае багацце? Фота: IREX/ProMedia

За апошнія месяцы з парку былі звольнены некалькі дзесяткаў спецыялістаў, якія адважыліся выказаць сваю незадаволенасць з учынку новага дырэктара. Сярод іх быў і намеснік па навуковай працы, кандыдат біялагічных навук Георгі Казулька. ¨н удзельнічаў у распрацоўцы некалькіх міжнародных прыродаахоўных праектаў. Пасля прызначэння дырэктарам М. Бамбізы праца па праектах, што, дарэчы, фінансаваліся з-за мяжы ў той самай валюце, была спыненая.

Нагадаем, што яшчэ міністр лясной прамысловасці былога СССР спадар Самойленка спрабаваў давесці мэтазгоднасць штогадовай высечкі драўніны з 75 тысячаў кубаметраў, якія высякаліся з санітарнымі мэтамі, аж да паўмільёна. Тагачасны дырэктар Уладзімір Раманаў здолеў абараніць пракаветную пушчу ад прамысловай высечкі. А што да сп. Бамбізы, то ёсць падставы меркаваць, што ён на абарону лесу не стане.

Навукоўцы, эколагі б'юць трывогу, што пушча стала прамысловым аб'ектам, лясной гаспадаркай. Даследаванні, навуковая дзейнасць адышлі на вельмі далёкі план. Былы намеснік па навуцы Нацыянальнага парка Георгі Казулька:

- Сённяшняя гаспадарчая дзейнасць супярэчыць прынцыпам аховы прыроды. Калі гаварыць пра тое, што пушча - гэта не проста нацыянальны парк, а біясферны запаведнік, у якім павінна захоўвацца дзікая прырода, то сёння пра пракаветны дзікі лес і гаворкі ісці не можа. Сёння ў Белавежскай пушчы наогул няма такога паняцця - дзікая прырода. Усё максімальна накіравана на задавальненне нейкіх гаспадарчых інтарэсаў. А ахову прыроды часцяком выкарыстоўваюць як прыкрыццё гэтых гаспадарчых метадаў. Праблема палягае ў тым, што ў нацыянальным парку, у запаветным лесе павінны выкарыстоўвацца спецыяльныя методыкі і тэхналогіі, якіх, магчыма, яшчэ і няма, але іх трэба распрацоўваць. Аднак сёння тут спрабуюць укараніць лясгасаўскія тэхналогіі. А яшчэ большая праблема ў тым, што ў парку створана абстаноўка, у якой практычна адсутнічаюць дыскусіі і абмеркаванне. Навука без гэтага бессэнсоўная. Навука - гэта спрэчкі, дыскусіі ў цывілізаваных рамках. Жорсткая камандна-адміністратыўная сістэма, асабліва ў навуцы, бессэнсоўная. У такіх умовах навука, вядома ж, існаваць не можа.



У павуцінні ўладных інтарэсаў апынулася ўся Пушча
Фота: IREX/ProMedia

Два тыдні таму вялікая група вядомых грамадскіх і навуковых дзеячоў Беларусі выступіла са зваротам да Рады Еўропы. Беларускія эколагі, дэмакратычная грамадскасць усхваляваныя сітуацыяй у Нацыянальным парку «Белавежская пушча». Яны просяць экспертаў Рады Еўропы не спяшацца з тым, каб падоўжыць дзеянне еўрапейскага дыплому Белавежскай пушчы. Сярод падпісантаў звароту такія вядомыя ў Беларусі людзі, як народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, акадэмік Радзім Гарэцкі, пісьменніца Святлана Алексіевіч, прафесар-фізік Юры Хадыка, галоўны рэдактар газеты «Белавежская пушча» Валерый Дранчук.

Выпадак, мякка кажучы, не зусім ардынарны: беларуская інтэлігенцыя заклікала ўплывовую міжнародную арганізацыю не спяшацца з падаўжэннем дзеяння еўрапейскага дыплому, накіраваць у пушчу экспертаў, здзейсніць кантрольную праверку выкарыстання папярэдніх мэтавых грантаў - і толькі потым прыняць узважанае рашэнне.

**Як паведаміла супрацоўніца Дэпартамэнта аховы навакольнага асяроддзя Рады Еўропы Француаза Баэр, 28 студзеня рашэнне прынята: Рада Еўропы працягнула дзейнасць еўрапейскага дыплому яшчэ на 5 гадоў, але з цэлым пакетам рэкамендацый і заўваг.**

І ўсё ж такі, ці ёсць выйсце з гэтай складанай сітуацыі? Меркаванне кандыдата біялагічных навук Георгія Казулькі.

Г.К.: - Выйсце? Павінны быць прынятыя цывілізаваныя правілы гульні. А гэта залежыць сёння толькі ад кіраўніцтва і ў пушчы, і ў Менску. А пакуль у прэсе з боку дырэкцыі нацыянальнага парку ўвесь час гаворыцца, што навукоўцы выступаюць супраць гаспадарання, супраць высечак лесу. Гэта не так. Мы, навукоўцы, не супраць гаспадарчых метадаў. Мы выступаем за тое, каб гаспадаранне не супярэчыла прынцыпам аховы прыроды.

Дарэчы, наша суседка, Польшча, знайшла цывілізаванае рашэнне. Польская тэрыторыя пушчы - гэта экалагічны прыродны запаведнік, і ні пра якую гаспадарчую дзейнасць гаворка нават не ідзе.

**Паводле «Радыё Рацыя» і www.brestonline.com**

## АБ'ЯВЫ

Берасцейскае абласное аддзяленне
**Грамадскага аб'яднання ПРАВААБАРОНЧЫ ЦЭНТР «ВЯСНА»**
прапануе грамадзянам бясплатную юрыдычную дапамогу.
(адміністратыўнае і грамадзянскае права, парушэнні правоў чалавека)
**Звяртайцеся на адрас:** г. Берасце, бульвар Шаўчэнкі, д. 7, кв. 24.
Тэл./факс: (0162) 20-13-95.

*АБ'ЕКТЫЎНА ПРА РЭАЛЬНАЕ*
**RR**
**РАДЫ¨ РАЦЫЯ**
***НА КАРОТКІХ ХВАЛЯХ***
*6035 кГц (49 м) 08:00-10:00*
*6180 кГц (49 м) 13:00-15:00*
*6050 кГц (49 м) 21:00-23:00*
***НА СЯРЭДНІХ ХВАЛЯХ***
*612 кГц (490 м) 07:00-11:00*
**WWW.RACYJA.PL**
*220102, Менск, а/с 144*

**УВАГА!**
ПРАЦЯГВАЕЦЦА БЯСПЛАТНАЯ ПАДПІСКА
**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "ДЗЕДЗІЧ".**
Калі вы жадаеце атрымоўваць яго больш стала і аперастыўна, запоўніце гэты купон і дашліце яго на адрас: **224000, г.Берасце, вул. Камуністычная, д.2, к.12.**
Прозвішча: ____
Імя: ____
Імя па бацьку: ____
Паштовы адрас: ____
Тэлефон: ____

# ЛЮТЫ:

(працяг. Пачатак на с.5)

## 2 ЛЮТАГА



2 лютага 1494 г. нарадзілася **Бона Сфорца**. Гэта імя першае прыходзіць на розум, калі гаворка заходзіць пра жанчыну на пасадзе кіраўніка Беларусі. Была ў нашых продкаў такая каралева і вялікая княгіня, італьянка Бона Сфорца, якая ўвайшла ў гісторыю сваёй цікавасцю да сельскай гаспадаркі і аграрнымі рэформамі.



2 лютага 1838 г. нарадзіўся **Кастусь Каліноўскі**, ідэолаг вызвалення Беларусі з-пад расейскага панавання, кіраўнік паўстання 1863 г. Расейцы павесілі Каліноўскага ў Вільні на Лукішскай плошчы. На гэтым месцы сёння ёсць мемарыяльная табліца. Яшчэ адна табліца памяці Каліноўскага ёсць на мурах дамініканскага касцёла, дзе змагар хаваўся ад мураўёўскага пераследу.

## 3 ЛЮТАГА

3 лютага 1927 г. — дата, якая ўвайшла ў беларускую гісторыю пад знакам **Косаўскага расстрэлу**. У гэты дзень у мястэчку Косава польскія ўлады расстралялі мірную дэманстрацыю людзей, якія выступалі ў абарону Беларускай сялянска-работніцкай грамады. На падтрымку грамады выйшла паўтары тысячы сялян. Дэманстранты прайшлі па вуліцы Косава, правялі мітынг. Калі яны зноў рушылі праз мястэчка, паліцыя пачала страляць. Было забіта шэсць чалавек і некалькі дзесяткаў паранена. Пахаванне забітых вылілася ў маніфестацыю пратэсту супраць свавольства паліцыі і польскай акупацыі.

## 4 ЛЮТАГА

У гэты дзень у 1746 г. нарадзіўся **Тадэвуш Касцюшка**. Поўнае імя ў яго было Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, а прыйшоў ён на свет у фальварку Мерачоўшчына пад Івацэвічамі. Напэўна, у той лютаўскі дзень ніхто са сваякоў у самых смелых фантазіях не ўявіў бы, які лёс чакае гэтага хлапца з беларускага шляхецкага роду. А пачынаў Касцюшка сваю кар'еру па вайсковай лініі. Скончыў Варшаўскі кадэцкі корпус, наведваў заняткі ў Парыжскай вайсковай акадэміі, пасля добраахвотнікам пайшоў на вайну за незалежнасць ЗША, стаў сябрам прэзідэнта Томаса Джэферсана. У 1784 г. Касцюшка вярнуўся на радзіму і тут узначаліў антырасейскае паўстанне 1794 г. Федэратыўная дзяржава Рэч Паспалітая ў складзе беларускіх, літоўскіх і польскіх земляў была



падзеленая паміж імперыямі. Наш край дастаўся Расеі. Вось жа супраць гэтай акупацыі і ўзнялося паўстанне на чале з Касцюшкам. У бітве пад Рацлавіцамі Касцюшкава войска разбіла расейскую армію. А ў бітве пад Мацяёвіцамі Касцюшка быў цяжка паранены і трапіў да расейцаў у палон. Патаемна, пад чужым прозвішчам "шляхціч Шыманскі" яго перавезлі ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Пасля вызвалення мужны змагар зноў пабываў у ЗША, а пасля вярнуўся ў Еўропу і памёр у Швейцарыі.

4 лютага 1808 г., акурат калі Касцюшка дажываў свае гады ў Швейцарыі, у фальфарку Панюшкевічы пад Бабруйскам нарадзіўся **Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч**, беларускі пісьменнік, творы якога ўсе ведаюць са школы. Дунін-Марцінкевіч — першы прафесійны пісьменнік, які пісаў па-беларуску. Рэч у тым, што іншыя літаратары таго часу ў нашым краі хоць і карысталіся ў побыце беларускай мовай, але пісалі пераважна па-польску, як да прыкладу Адам Міцкевіч або Ян Чачот. Пісанае па-беларуску лічылася забавай або этнаграфізмам. І паэты, якія хацелі зрабіць прафесійную літаратурную кар'еру, выбіралі польскую мову. Патрабавалася пэўная адвага, каб стаць прызнаным пісьменнікам, што піша па-беларуску. Бо найперш трэба было сцвердзіць права на існаванне ў літаратуры самой мовы, а тады ўжо паказаць свой талент. Вось жа Дуніну-Марцінкевічу такой адвагі хапіла. Сілаю таленту ён здолеў пераадолець гэты бар'ер, і ніхто не ўспрымае яго як жартаўніка або этнаграфічнага пісьменніка.

4 лютага 1929 г. нарадзіўся беларускі мастак **Лявон Баразна**. ¨н першы стаў складаць альбомы з выявамі беларускага народнага адзення і арнаментаў, даследаваў гравюры Скарыны. Баразну забілі пры невысветленых абставінах у 1972г. Афіцыйная версія — хуліганы, іншыя цвердзяць, што гэта была правакацыя КДБ. Рэч у тым, што Баразна смела браўся за забароненыя на той час тэмы, і вакол яго галавалася шмат творчай моладзі. Пазней гэтыя вучні і сябры будуць працягваць тыя справы, якія запачаткаваў Лявон Баразна.



4 лютага 1931 г. скончыў жыццё самагубствам **Усевалад Ігнатоўскі**, беларускі гісторык, акадэмік. Ігнатоўскі займаў у Беларусі важныя дзяржаўныя пасады ў часы савецкай беларусізацыі 20-х гадоў. Але на пачатку 30-х гэтай беларусізацыі прыйшоў канец. Ігнатоўскага сталі публічна называць лідэрам нацыянал-дэмакратычнай контррэвалюцыі і кулацкім агентам, пачаліся выклікі на допыты ў ГПУ. Каб усяго гэтага не чуць і не бачыць, шанаваны ў краіне чалавек мусіў зрабіць сабе смерць.

4 лютага ў 1978 г. пакінуў гэты свет беларускі паэт **Аркадзь Куляшоў**.

## 5 ЛЮТАГА

5 лютага 1921 г. нарадзіўся **Мікола Алексютовіч**, беларускі філосаф. На мяжы 60-х і 70-х гадоў ён надрукаваў у часопісе "Полымя" нашумелы артыкул, які называўся "А дзе жісціна аб`ектыўная", дзе даводзіў, што беларуская гісторыя пачалася зусім не ў 1917 годзе, як гэта і сёння любяць сцвярджаць афіцыйныя чыноўнікі, а з глыбокай старажытнасці і што Вялікае Княства Літоўскае для беларусаў было не дзяржавай-захопнікам, а сваім дзяржаўным утварэннем на працягу 500 гадоў.

## 6 ЛЮТАГА

6 лютага ў 1898 г. нарадзіўся беларускі гісторык **Леў Акіншэвіч**. ¨н прыйшоў на свет у Санкт-Пецярбургу, вучыўся ў Кіеўскім універсітэце, але заўсёды пачуваўся беларусам. Таму, калі ў 1918г. была створана незалежная Беларуская Народная Рэспубліка, Акіншэвіч адразу прыняў грамадзянства БНР. Як гісторык, ён вывучаў сярэднявечнае права і казацтва ў Беларусі. У 30-я гады бальшавікі абвінавачвалі яго адначасова ў беларускім і ўкраінскім нацыяналізме. Аднак адразу пасля вайны яму ўдалося не патрапіць у сталінскія Гулагі і ўцячы на эміграцыю. У ЗША Акіншэвіч здолеў працягваць сваю навуковую дзейнасць у Беларускім інстытуце навукі і мастацтва ў Нью-¨рку.

6 лютага 1914 г. нарадзіўся **Аркадзь Куляшоў**. Адзін са стаўпоў беларускай савецкай літаратуры. Гэта ён у 14 гадоў напісаў таленавіты верш "Алеся", які пасля стаў славутай песняй. Куляшоў заўсёды быў на вышыні сітуацыі, перажыў і часы сталінскіх рэпрэсіяў, калі большасць яго калег былі расстраляныя або высланыя ў канцлагеры, перажыў вайну і заўсёды пісаў ідэалагічна правільныя вершы пра партыю, Леніна і камуністаў, пра знаёмы ўсім з падручнікаў сцяг брыгады і камсамольскі білет. Памятаеце?

"Цвёрда трымаўся юнак на дапросе,
Тоячы думкі і словы свае.
Вораг-жандар дакурыў папяросу
І камсамольскі білет дастае". Гэты верш, дарэчы, таксама пакладзены на музыку, і яго таксама, як і "Алесю", спявалі "Песняры".

## 7 ЛЮТАГА

7 лютага 1546 г. ў Ляхавічах прыйшоў на свет **Фёдар Еўлашоўскі**, беларускі палітык і пісьменнік-мемуарыст. Гісторыкі адзначаюць, што Еўлашоўскі меў шырокія веды ў галіне матэматыкі, справаводства і юрыспрудэнцыі. Ездзіў паслом на соймы Рэчы Паспалітай і прадстаўляў там наваградскую шляхту. Еўлашоўскі — адзін з аўтараў тагачаснага крымінальнага кодэксу — "Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага". Ягонаму пяру належыць самы ранні твор мемуарнага жанру ў беларускай літаратуры, які называўся "Гістарычныя запіскі". З тых запісак тагачасныя людзі і край паўстаюць для нас і сёння як жывыя.

## 8 ЛЮТАГА

8 лютага 1676 г. памёр расейскі цар **Аляксей Міхайлавіч**. У расейскую гісторыю ён увайшоў як «цішайшы і дабрэйшы». У беларускую — як агрэ-

# ПАЭЗІЯ СВАБОДЫ

сар, пры якім у выніку трынаццацігадовай вайны быў забіты кожны другі жыхар нашага краю. Гэта самы трагічны для Беларусі вынік за ўсе войны ва ўсе часы. У некаторых раёнах краіны не засталося і траціны насельніцтва.

У гэты ж дзень у 1886 г. нарадзіўся беларускі гісторык **Васіль Дружчыц**. Скончыўшы Юр‘еўскі універсітэт, прафесар Дружчыц выкладаў беларускую гісторыю ў Вільні, Шаўлях, Рэчыцы, Бабруйску, нарэшце — у Беларускім дзяржаўным універсітэце. Васіль Дружчыц вывучаў сярэднявечныя гарады і гісторыю кнігадрукавання. У чорнай памяці 1937-м годзе яго арыштавалі і расстралялі 20 снежня. Яшчэ адзін згублены лёс у ліку тысячаў лёсаў, што падпалі пад сталінскае вынішчэнне беларускай інтэлігенцыі.

## 9 ЛЮТАГА

Як на добры лад, менавіта сёння мусіў бы адзначацца **Дзень беларускага тэатра**, бо якраз 9 лютага была пастаўлена першая беларуская опера. Адбылося гэта ў 1892 г. ў Менску ў тэатры, які належаў чалавеку з прозвішчам Поляк. Кампазітар Станіслаў Манюшка разам з Канстанцінам Крыжаноўскім і сябрамі напісалі музыку да п‘есы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Двухактавая камедыя-опера мела назву “Сялянка“ або “Вясковая ідылія“. Героі ўпершыню спявалі на той мове, якой аўтары гаварылі між сабой — па-беларуску. Не па-польску, як было прынята дагэтуль. І не парасейску — на мове акупантаў. Расейская цэнзура спахапілася: чаму на «простанародным наречіі»? Прэм‘ерную афішу цэнзура расклейваць забараніла. Акцёры саматугам разносілі запрашэнні.

Спектакль выклікаў фурор. Публіка была ў захапленні. Сам драматург выступіў у ролі войта Навума, спявалі сяляне, прывезеныя з Люцынкі. Адбылося некалькі паказаў у Менску, Бабруйску, Слуцку, Глуску. Урэшце спектакль быў усё ж забаронены. Апошнюю афішку недзе ў сталінскай ссылцы згубіў Альберт Паўловіч. Ноты Станіслава Манюшкі былі згубленыя. Будынак тэатру ў Менску на рагу вуліц Леніна і Інтэрнацыянальнай, нягледзячы на пратэсты моладзі, быў знесены на пачатку перабудовы. І толькі маленькая кніжачка лібрэта, выдадзеная ў 1846 годзе ў віленскай друкарні Юзафа Завадскага, датрывала да нашых дзён.

9 лютага 1867 г. пакінуў наш свет **Кароль Нямцэвіч** — славуты паўстанец і змагар за свабоду краю. Нямцэвіч скончыў Свіслацкую гімназію, вучыўся ў Віленскім універсітэце. Калі пачалося антырасейскае паўстанне 1831 г., Нямцэвіч распрацаваў план захопу Горадні і быў там паўстанцкім начальнікам. Пасля з атрадам перабраўся ў Беласток і, адступаючы ў Белавежу, каля Каралёва Моста ў бітве разбіў непрыяцеля. Пасля здушэння паўстання Нямцэвіч, тады ўжо кавалер ордэна Віртуці Мілітары, эміграваў у Парыж, дзе заняўся выдавецкай дзейнасцю.

9 лютага 1886 г. нарадзіўся **Аляксандар Мяснікоў**, адзін з першых камісараў-начальнікаў БССР, які лічыў, што беларусаў як асобнага народу няма. Сапраўднае яго прозвішча Мяснікян, і да нас ён прыбыў з Расеі разам з бальшавіцкай рэвалюцыяй. Такі сабе ваенна-камуністычны дзеяч з тых, што з гонарам любяць паўтараць — мы універсіцетаў не канчалі, быццам невуку і сапраўды ёсць чым ганарыцца.

9 лютага 1991 г. у Літоўскай рэспубліцы праводзіцца **рэферэндум аб незалежнасці**. Яшчэ стаяць на вуліцах чэргі, яшчэ жывыя савецкія дэфіцыты і картачная сістэма, тым не менш людзі абсалютнай большасцю выказваюцца за выхад краіны з СССР.

## 11 ЛЮТАГА



11 лютага 1807 г. нарадзіўся слынны дзеяч нашага краю, мастак і кампазітар **Напалеон Орда**. Орда прыйшоў на свет у Варацэвічах пад Янавым (Іванава), адукацыю атрымаў у Парыжы і ў Віленскім універсітэце. Яшчэ студэнтам Орда ўдзельнічаў у антырасейскім паўстанні 1831г. ¨н сябраваў з Шапэнам і Міцкевічам, пісаў вальсы, мазуркі, серэнады. Орда шмат падарожнічаў па Беларусі, Літве, Польшчы і Украіне, рабіў замалёўкі помнікаў дойлідства і ўсялякіх славутых мясцін. Віды вёсак, маёнткаў, замкаў, палацаў, гарадоў, якія намаляваў Орда — часта адзінае сведчанне пра помнікі архітэктуры, якіх даўно няма ані ў рэчаіснасці, ані на фота. Таму асабліва каштоўнае тое, што Орда маляваў вельмі дакументальна, нічога не прыдумляючы. Праўда, пры гэтым на яго творах перададзены і настрой аўтара, і сама атмасфера XIX ст. Рэпрадукцыі гэтых твораў неаднойчы выдаваліся альбомамі.

11 лютага 1918 г. нарадзіўся **Аляксандр Салжаніцын**, расейскі антысавецкі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі.

## 12 ЛЮТАГА



12 лютага 1798 г. пакінуў гэты свет **Станіслаў Аўгуст Панятоўскі**, апошні польскі кароль і Вялікі князь Літоўскі. ¨н паходзіў з беларускай шляхты і пахаваны на тэрыторыі Беларусі — у Воўчыне каля Вяліка-Літоўска. Яму прыпісваюць адначасова росквіт і заняпад краю. Сапраўды, за Панятоўскім у Вялікім княстве рабіліся вялікія пераўтварэнні і развіваліся мастацтвы, але за ім жа Княства і ўся Рэч Паспалітая была падзеленая паміж трыма імперыямі і фактычна перастала існаваць як самастойная дзяржава. Беларускія і Літоўскі землі былі захоплены Расеяй.

## 14 ЛЮТАГА

14 лютага 1907г. нарадзіўся беларускі паэт **Алесь Звонак**. Гэта рэдкі выпадак, калі дзеяч найноўшай беларускай культуры прыйшоў на свет у цяперашняй сталіцы Беларусі - Менску. Затое лёс у Звонка тыповы. У 1936-м ён быў арыштаваны і на 10 гадоў высланы ў Магадан. Вярнуўся ажно праз 20 гадоў. Можна сабе ўявіць, як гэта было няпроста для ўчарашняга ворага народа — вярнуцца.

Паэтам няпроста было не толькі за Сталінам. Наогул, у народзе распаўсюджана думка, што пісаць вершы — амаль тое самае, што гультайнічаць. Чаму ж тады дастаецца паэтам заўсёды ад усялякіх палітычных рэжымаў? Можа таму, што дыктатура знішчае найперш свабоду. А менавіта пішучы вершы, чалавек пачуваецца найбольш вольным.

## 15 ЛЮТАГА

15 лютага — **Грамніцы** або Стрэчанне. Земляробчае свята сустрэчы зімы і лета. Першая назва, як мяркуюць, пайшла ад паганскага бога Грамаўніка, які ўтварае вясновыя навальніцы і дажджы. Пасля гэтага дня зімовая ўлада мусіла скончацца. Людзі казалі — “На грамніцы – паўзіміцы“, або “Як прыйдуць Грамніцы – скідай рукавіцы“. Менавіта так гэтае свята называлася і адзначалася ў беларускай дахрысціянскай традыцыі. А другая назва – Стрэчанне – паходзіць ад царкоўнага “Срэцення“, якое народ перакруціў на простае і зразумелае.

А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне,
Зіма з летам стрэлася, стрэлася
Лета зіму піхнула, піхнула
І ножачку звіхнула, звіхнула
Зіма пайшла плачучы, плачучы,
Лета пайшло скачучы, скачучы.

15 лютага 1904г. нарадзілася **Ларыса Александроўская**, ці не самая славутая беларуская оперная спявачка, чый творчы росквіт прыпаў на сталінскую эпоху. Тады некаторыя імянітыя артысты мелі ў грамадстве часам большую вагу, чым міністры. Да таго ж Ларыса Александроўская была кіраўніцай галоўнага тэатру краіны – Менскай оперы. Яна і нарадзілася ў Менску, а ў ейнага бацькі было незвычайнае імя — Пампей. Таму яе называлі Ларыса Пампееўна.


HOMAN
Biełaruskaja Wilenskaja časopiś
№ 53 (279). Hod III. Wilnia. 22 kastryčnika 1916 h. Cena 10 fen. (5 kap.)
Dola našaha kraju.
Palonny kraj.

15 лютага 1916 г. у Вільні выйшаў першы нумар газеты **“Гоман“**. Гоман выходзіў два разы на тыдзень лацінкай і кірыліцай і быў галоўнай на той час беларускай газетай. Выдавалі газету тыя самыя людзі, якія перад тым выдавалі “Нашу Ніву“. “Гоман“ выступаў за нацыянальна-культурнае адзінства беларускага народа, незалежную беларускую рэспубліку, якая магла б на канфедэратыўнай аснове ўваходзіць у адроджанае ВКЛ. Менавіта “Гоман“, які праіснаваў да канца 1918 г., найбольш поўна адлюстроўваў усе падзеі беларускага палітычнага жыцця, звязаныя з Усебеларускім кангрэсам і ўтварэннем Беларускай Народнай Рэспублікі. Друкавалася там і шмат асветнага ды мастацкага матэрыялу.

15 лютага 1936 г. Адольф Гітлер аддае загад стварыць **“Фальксваген”** або народны аўтамабіль. Гледзячы на велізарную колькасць самых розных фальксвагенаў, якія сёння ездзяць па вуліцах і дарогах нашага краю, і не падазраеш, што пачатак гэтай фірме даў гітлераўскі загад. А яшчэ

**(заканчэнне на с.10)**

ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

# ЛЮТЫ:

**(Заканчэнне. Пачатак на с.5)**

згадваюцца спробы Лукашэнкі стварыць якісці саюзны тэлевізар. Тыпалагічна гэта ідэі аднаго парадку: народны аўтамабіль, саюзны тэлевізар.

У Расеі адзначаецца чарговая гадавіна вываду савецкіх войск з **Афганістану**. Менавіта 15 лютага 1989г. ў 10.30 расейскі генерал Громаў апошні перайшоў мост цераз Аму-Дар'ю на мяжы СССР і Афганістана. Так завяршылася неабвешчаная вайна, якая доўжылася крыху болей за 9 гадоў. Вайна была не толькі неабвешчаная, але і бессэнсоўная, нікому не патрэбная, апроч ленінскага Палітбюро ЦК КПСС, дзеля задавальнення амбіцый яго састарэлых чальцоў. За час вайны ў Афганістане перабылі больш за 700 тысяч савецкіх вайскоўцаў. Каля 15 тысяч з іх загінулі, 6 тысяч памерлі пазней — ад ранаў. А ўвогуле параненыя былі амаль 50 тысяч вайскоўцаў. 311 чалавек прапалі без звестак. Вайна каштавала Савецкаму Саюзу 50 млрд даляраў. Інваліды Афганістану дагэтуль жывуць па ўсім былым СССР. Чытаючы гэтыя звесткі, міжволі звяртаеш увагу на тое, што нідзе не публікуецца статыстыка стратаў, якія ў выніку той вайны панеслі афганцы.

## 16 ЛЮТАГА



16 лютага 1757 г. ў вёсцы Скокі цяперашняга Берасцейскага раёну нарадзіўся **Юльян Нямцэвіч** – слынны змагар і пісьменнік, ад'ютант Тадэвуша Касцюшкі. ¨н вучыўся ў Берасцейскім езуіцкім калегіуме, пасля ў Варшаўскім кадэцкім корпусе. У часе антырасейскага паўстання 1794г. Нямцэвіч разам з Касцюшкам патрапіў у палон і быў зняволены ў Петрапаўлаўскай крэпасці. Пасля разам са сваім камандзірам выехаў на нейкі час у Амерыку. Вярнуўшыся на Радзіму, ён браў удзел у паўстанні 1831 году. Прызнацца, цяжкавата ўявіць сабе паўстанца, якому 74 гады. Тым не менш, пасля паразы паўстання Нямцэвіч выязджае ў эміграцыю, дзе цалкам прысвячае сябе літаратурнай дзейнасці, на што Бог падарыў яму яшчэ 10 плённых гадоў. Апроч раманаў, камедый і патрыятычных песень, Юльян Нямцэвіч пісаў яшчэ і мемуары, у якіх пераказваў сваё надзвычай багатае жыццё і распавядаў пра прыгажосць сваёй Радзімы – Беларусі.

16 лютага 1895 г. нарадзіўся яшчэ адзін знакаміты беларускі вайсковец — **Францішак Кушаль**. ¨н з Пяршаяў пад Валожынам. Скончыў Віленскую пяхотную вучэльню, адкуль быў адпраўлены на фронт першай Сусветнай вайны. Пасля браў удзел у розных беларускіх арганізацыях, служыў у польскім войску. У часе другой Сусветнай вайны Францішак Кушаль рабіў шмат высілкаў, каб у акупаванай немцамі краіне стварыць самастойнае беларускае войска. Беларуская краёвая абарона – гэта яго плён. Пасля вайны мусіў эміграваць і рэшту жыцця правёў у Амерыцы. Быў старшынёй Беларуска-Амерыканскага Задзіночання. А побач з ім праз усе жыццёвыя выпрабаванні ішла разам яго жонка – славутая паэтка **Наталля Арсеннева**.

## 17 ЛЮТАГА

У такі самы дзень, 17 лютага 1600 г. на пляцы ў Рыме запалала вогнішча. На вогнішчы тым гарэў чалавек, які не згадзіўся адмовіцца ад сваіх перакананняў. І быў гэта **Джардана Бруна**, італьянскі філосаф і пісьменнік. З юнацтва вылучаўся Джардана незалежнасцю сваіх поглядаў, за што праз усё жыццё і цярпеў. ¨н мусіў вандраваць па гарадах Італіі, жыў у Жэневе, дзе нейкі час захапляўся кальвінізмам, выкладаў у Тулузе. Менавіта там была напісана яго найлепшая камедыя “Падсвечнік“. У Англіі выйшлі з друку яго славуты твор “Пра бясконцасць, Сусвет і планеты“, у якім Бруна следам за Капернікам адстойваў геліяцэнтрычную сістэму Сусвету, а таксама дыялогі на тэмы маралі і грамадскага ўладкавання. Пісаў Бруна таксама вершы і паэмы. І вось аднойчы высокі апякун запрасіў яго ў Венецыю і выдаў інквізіцыі. Пасля доўгага судзілішча Джардана Бруна быў спалены на вогнішчы.

## 18 ЛЮТАГА

18 лютага 1845 г. пакінуў гэты свет **Ігнат Анацэвіч**, беларускі гісторык і архівіст. Нарадзіўся ён у Малой Бераставіцы, паступіў спачатку ва універсітэт у Каралеўцы, а скончаў ужо Віленскі універсітэт, дзе пасля стаў прафесарам. Праўда, пабыў ён прафесарам усяго год, бо звінавацілі Анацэвіча ва ўдзеле ў студэнцкай арганізацыі “Плямёны сарматаў“ і выслалі дахаты. А тады ўжо апынуўся ён у Пецярбургу. Вывучаў там гісторыю ВКЛ, збіраў усялякія старыя дакументы. Свае артыкулы падпісваў псеўданімам Жэгота з Малой Бераставіцы. Галоўная праца Анацэвіча – “Гісторыя Літвы“ – так і не была надрукаваная, а рукапіс паводле запавету аўтара перайшоў Юзафу Крашэўскаму.

18 лютага 1893 г. нарадзіўся найбуйнейшы беларускі пісьменнік і вучоны XX ст. **Максім Гарэцкі**. Друкавацца ён пачаў яшчэ ў 1912 г. ў віленскай “Нашай Ніве“, таксама ў Вільні праз два гады выйшаў яго першы зборнік – “Рунь“. Гарэцкі быў выкладчыкам літаратуры ў Віленскай беларускай гімназіі і напісаў першы падручнік па гісторыі беларускай літаратуры. Наогул жыццё і творчасць Гарэцкага шчыльна перапляліся з Вільняй, не аднойчы ён апісваў гэты горад у сваіх творах.

## 19 ЛЮТАГА

Паводле гараскопу ў гэты дзень пачынаецца час Рыбаў. А Рыба – гэта знак Вады. Людзі, якія нарадзіліся ў наступныя трыццаць дзён, рахманыя, уражлівыя, яны, між іншым, вераць у гараскопы, яны вельмі музычныя. Нездарма Рыбамі былі Шапэн, Вівальдзі, Равэль. Кажуць, Рыбы – прыроджаныя апекуны, сёстры міласэрнасці, выхавальнікі дзяцей. Сярод славутых рыбаў трэба згадаць Радзівіла Пане Каханку і ерэтыка Казіміра Лышчынскага, які быў пакараны смерцю за свой “Трактат пра неіснаванне Бога“. Тутсама – пісьменнікі ад украінца Шаўчэнкі да японца Акутагавы, а яшчэ – Гюго, Ібсэн, Гогаль і нават пралетарскі пісьменнік нумар адзін Максім Горкі. Тут і беларускія навукоўцы, палітыкі, дойліды Аркадзь Смоліч, Алесь Чарвякоў, Клаўдзій Дуж-Душэўскі. Калі істотны не толькі сам знак, але і дата нараджэння, тады варта супаставіць асобаў, якія нарадзіліся ў адзін дзень і, калі верыць гараскопу, мусяць мець аднолькавы характар. Кандрат Крапіва, напрыклад, нарадзіўся ў адзін дзень з Шапэнам, а Францішак Багушэвіч – з Францішкам Аляхновічам. А яшчэ Рыба – народны беларускі паэт Рыгор Барадулін.

19 лютага 1473 г. нарадзіўся **Мікалай Капернік**, які стварыў тэорыю геліяцэнтрычнай мадэлі свету, гэта значыць, што Зямля стала круціцца вакол Сонца, а не наадварот, як было дагэтуль. У нашых краях Каперніка ведалі з XVI ст. Яго погляды адлюстраваны ў філасофскіх працах нашых тагачасных вучоных – Нарбута і Доўгірда. Яны трактавалі тэорыю Каперніка як слушную. Між іншым, насуперак папскай буле пра “Індэкс забароненых кніг“, у які былі ўключаныя і Каперніказы працы.

Наступная дата звязаная з папярэднім абвяшчэннем незалежнасці Беларусі. 19 лютага 1918 г. ў Менску выканаўчы камітэт Усебеларускага з'езда стварыў **Народны сакратарыят** – часовы ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі. Пазней народны сакратарыят быў перайменаваны ў Раду БНР. Узначальваў сакратарыят Язэп Варонка. А сённяшнюю Раду ачольвае Івонка Сурвіла, якая жыве ў Канадзе.

## 20 ЛЮТАГА



20 лютага 1810 г. пакінуў гэты свет **Марцін Пачобут-Адляніцкі**, славуты віленскі астраном і асветнік. Нарадзіўся ён у вёсцы Саломенка на Гарадзеншчыне, вучыўся ў Гарадзенскім і Полацкім езуіцкіх калегіумах і у Слуцкай педагагічнай семінарыі. Гэта Пачобут-Адляніцкі арганізаваў і ўзначаліў Віленскую астранамічную абсерваторыю, быў прафесарам Віленскай акадэміі, рэктарам Галоўнай школы Вялікага Княства Літоўскага. Назіраў зоркі, планеты і астэроіды, адкрыў новае сузор“е.



20 лютага 1947 г. нарадзіўся сапраўдны герой нашага часу – тэатральны рэжысёр **Валерый Мазынскі**. Стваральнік менскага тэатру “Вольная сцэна“, Мазынскі быў адхілены ўладамі ад пасады кіраўніка тэатру, а пасля таго, як заявіў пра незалежнае існаванне “Вольнай сцэны“, быў жорстка збіты на менскай вуліцы (на фота ён як раз пасля сустрэчы з «прыхільнікамі» свайго таленту). А паходзіць Валерый Мазынскі з вёскі Вялікае Стахава Барысаўскага раёну. Сябры заўсёды ўважалі Мазынскага за шчырага патрыёта і добрага, нават мяккага чалавека. Але сённяшні палітычны рэжым з самых рахманых беларусаў робіць цвёрдых змагароў.

## 21 ЛЮТАГА

21 лютага 1940 г. ў гітлераўскай Нямеччыне пачынаецца будаўніцтва першага лагера масавага знішчэння **Асвенцыма**. Быццам не самая прык-

*Ад прадзедаў, спакон вякоў... (Я. Купала)*

# ПАЭЗІЯ СВАБОДЫ

метная, на першы погляд, падзея. Ажно колькі жахлівых чалавечых трагедыяў стаіць за гэтым будаўніцтвам.

## 27 ЛЮТАГА

27 лютага 1612 г. пачала працу **Любчанская друкарня** – у Любчы пад Наваградкам. Усяго яна выпусціла больш за 80 кніжак па-лацінску і папольску. Галоўным чынам гэта былі выданні свецкага зместу: антычныя і гістарычныя творы, практычныя дапаможнікі па медыцыне, ветэрынарыі і школьнай справе, літаратурныя творы. Напрыклад, былі паміж іх “Генеалогія, або Кароткае апісанне вялікіх літоўскіх князёў“ Стрыйкоўскага ў перапрацоўцы Доўгірда, “Гісторыя юдэйскай вайны“ Флавія, “Апафегматы“ Буднага, “Статут Слуцкай школы“ ды іншыя. Любчанская друкарня стала адной з дзесяткаў, якія ў тыя часы былі адкрыты ў нашым краі і сведчылі пра вучонасць і еўрапейскі ўзровень развіцця Беларусі на пачатку XVII стагоддзя. Парадокс, але ў сённяшняй Беларусі сур`ёзных навуковых кніг з гісторыі свайго краю выпускаецца не больш, чым у тыя прадаўнія гады.

27 лютага 1903 г. нарадзіўся беларускі паэт **Міхась Явар**. Сапраўднае яго прозвішча было Карась, а прыйшоў ён на свет у Мінявічах на Мастоўшчыне. Явар – з тых творцаў, якіх называюць заходнебеларускімі паэтамі, гэта значыць, што жыў і працаваў ён у міжваенны час на тэрыторыі Беларусі пад польскай акупацыяй. Друкаваўся ў віленскіх выданнях – “Беларускай газеце“ і часопісе “Шлях моладзі“. У даведніках яго біяграфія сканчаецца словамі: даведзены да адчаю, Явар скончыў жыццё самагубствам. І адбылося гэта ў 1933 г. Як і большасць творцаў яго пакалення, Явар пісаў вершы на сацыяльныя тэмы і збавення душы шукаў па-за царквою, адмаўляючы як буржуазныя, так і клерыкальныя каштоўнасці.

27 лютага 1912 г. нарадзіўся ангельскі пісьменнік **Лоўрэнс Дарэл**. У 1993-м годзе ў “Нашай Ніве“ друкаваўся ўрывак з яго рамана “Юстына“, і гэта быў першы пераклад твораў Дарэла па-беларуску. На сённяшні дзень – першы і апошні.

## 28 ЛЮТАГА

28 лютага ў 1468 г. у дзяржаве нашых продкаў, Вялікім Княстве Літоўскім, прымаецца першы крымінальны кодэкс, так званы **Судзебнік**, які яшчэ называюць Статутам Казіміра. Напісаны ён быў на старабеларускай мове і спарадкаваў усе віды злачынстваў і пакаранняў. Пры гэтым Судзебнік захоўваў нормы звычаёвага права.

28 лютага 1768 г. была створана **Барская канфедэрацыя**. Гэта акурат у тыя часы, калі аслаблае Вялікае Княства Літоўскае часткамі пачынала захопліваць Расейская імперыя. Барская канфедэрацыя ўяўляла сабой аб‘яднанне шляхты, дзеячоў царквы і кіраўніцтва дзяржавы для барацьбы супраць уплыву Расеі на каралеўскі ўрад, а таксама дзеля захавання шляхецкіх вольнасцяў. Заснаваны гэты звяз быў у горадзе Бар на Падоллі. Выступы канфедэратаў, якім дапамагалі Турцыя, Францыя і Аўстрыя, прывялі да міжусобных войнаў. Войскам канфедэратаў камандаваў Міхал Агінскі. Праз чатыры гады гэта войска будзе разбіта расейскай арміяй на чале з Аляксандрам Суворавым у бітве пад Сталавічамі каля Баранавічаў.

28 лютага 1942 г. пакінуў гэты свет беларускі гісторык **Канстанцін Кернажыцкі**, які вывучаў эканамічную гісторыю краіны. Кернажыцкі памёр у сталінскім Гулагу.

## 29 ЛЮТАГА

29 лютага 1872 г. нарадзіўся беларускі мастак Вітальд Бялыніцкі- Біруля, аўтар тонкіх жывапісных краявідаў.

Пісьменніца Ядвіга Бяганская таксама прыйшла на свет 29 лютага ў 1908 г.

Цікава, як гэтыя людзі адзначалі дні свайго нараджэння? Хіба кожны чацверты год, ці пераносілі на 28-га?

**Гістарычны сектар «Дзедзіча»**

АБ‘ЯВЫ

# NED РАСПАЧАЛА ПРАГРАМУ REAGAN-FASCELL DEMOCRACY PROGRAMM

Амерыканская недзяржаўная некамерцыйная арганізацыя The National Endowment for Democracy (NED) абвесціла аб пачатку праграмы Reagan-Fascell Democracy Programm. Праграма разлічаная на актывістаў грамадскіх арганізацый, навукоўцаў і журналістаў, якім патрабуюцца веды ў вобласці дэмакратыі.

Удзел магчыма прыняць у двух курсах: курс «Практык»\Practitioner» уключае сустрэчы і дыскусіі з амерыканскімі калегамі і экспертамі і прызначаецца для ўдасканалення практычных і тэхналагічных навыкаў і абмена вопытам (на працягу 3-5 месяцаў); курс «Даследаванне і Напісанне»\Research and Writing» уключае напісанне даследчыцкай працы ці журналісцкіх матэрыялаў (на працягу 5-10 месяцаў).

Кожны практыкант будзе атрымліваць штомесячную стыпендыю ($3,5-7,5 тыс.), медыцынскую страхоўку і аплату расходаў на падарожжы. Дадаткова магчыма аплата дзелавых паездак па ЗША.

Для жадаючых прыняць удзел у праграме Practitioner Track неабходна даслаць на 5-10 старонках: апісанне працы, якую прэтэндэнт робіць дзеля пабудовы і ўмацавання дэмакратыі ў сябе на радзіме; мэты і задачы, якія ён хоча дасягнуць у выніку ўдзелу ў праграме, уключаючы сюды крыніцы інфармацыі, доступ да якіх ён жадае атрымаць і г.д.; папярэдні праект сваёй даследчыцкай ці журналісцкай працы; думкі аб тым, як гэтая праграма можа дапамагчы справе дэмакаратыі ў яго краіне, рэгіёне і г.д.

Для жадаючых прыняць удзел у праграме Research and Writing Track неабходна даслаць на 5-10 старонках: думкі пра тое, як іх праект можа дапамагчы тэорыі і практыцы разумення дэмакратыі грамадствам; кароткае апісанне таго, як прагназуемае даследаванне ўпісваецца ў агульны кантэкст публікацый на гэтую тэму; указанні, якім чынам удзел у праграме дазволіць аблегчыць гэтую працу; інфармацыя аб папярэдніх публікацыях (кнігі, даклады, артыкулы і г.д.).

Дадаткова неабходныя : 8 (восем) копій падрабязных CV ці рэзюмэ; 3 (тры) рэкамендацыйных лісты; указанне пажаданай даты і працягласці практыкі.

Тэрмін атрымання дакументаў ад жадаючых прыняць удзел у асенне-зімовых праграмах 2002 г. - 1 красавіка 2002 года (рэгістрацыя будзе праведзеная ў канцы чэрвеня 2002 года). Для жадаючых прыняць удзел у праграмах 2003 года - 17 верасня 2002 года (рэгістрацыя будзе праведзеная ў канцы студзеня 2003 года). Усе звесткі патрэбна дасылаць поштай, пажадана электроннай.

**Паштовы адрас:** Program Assistant, Fellowship Programs. International Forum for Democratic Studies, National Endowment for Democracy, 1101 15th street, N.W., Suite 800, Washington, DC 20005. tel 202-293-0300, fax 202-293-0258. E-mail: fellowship@ned.org

Больш падрабязную інфармацыю магчыма паглядзець на сайце www.ned.org

# СТАЖЫРОЎКА Ў ПОЛЬШЧЫ ПА СТЫПЕНДЫІ ЛЭЙНА КІРКЛАНДА

Польска-амерыканскі Фонд Свабоды (Polsko-Amerykanska Fundacja Wolnosci) сумесна з Польска-амерыканскай камісіяй Фулбрайта абвяшчае адкрыты конкурс на праграму стыпендыяў імя Лэйна Кіркланда (Lane Kirkland Scholarship Program) на 2002-03 акадэмічны год. Праграма ставіць за мэту перадачу і распаўсюджванне польскага досведу ў галіне сістэмнай трансфармацыі іншым краінам Усходняй Еўропы ў межах дадатковага двухсеместровага навучання ў польскіх ВНУ сумесна са стажыроўкай у дзяржаўных і прыватных установах на працягу некалькіх тыдняў. Праграма працуе ў галінах: эканоміка і кіраванне; грамадская адміністрацыя (урадавая і самакіраванне); бізнэс-адміністрацыя; права; палітычныя навукі; сацыяльныя навукі.

Праграма Кіркланда накіравана на прэтэндэнтаў, якія гатовы выкарыстаць набытыя ў Польшчы веды і ўменні, а таксама прадстаўляюць наступныя асяродкі: выкладчыкі ВНУ; эксперты, палітыкі, супрацоўнікі ўрадавых устаноў і самакіравання; прадпрымальнікі і менэджэры; лідэры недзяржаўных арганізацый; журналісты.

Прэтэндэнты павінны быць ва ўзросце да 35 гадоў (у выключных выпадках да 40 гадоў), актыўна працаваць у сваім асяродку, мець значныя дасягненні. Неабходна мець вышэйшую адукацыю (для кандыдатаў з ВНУ - пажадана ступень доктара/кандыдата навук), ведаць польскую (альбо англійскую) мову на ўзроўні, што забяспечвае разуменне лекцыяў і семінараў, досвед працы па спецыяльнасці - не менш 2 гадоў.

Неабходныя дакументы: заява (асабістая анкета з фотаздымкам, ліст з матывацыяй удзелу ў праграме і прапановамі адносна перабывання і планамі, звязанымі з яго заканчэннем (да 2 старонак); Curriculum Vitae разам са спісам публікацыяў; два лісты, дзе апісаны дасягненні і кваліфікацыя кандыдата і далейшыя планы, звязаныя з яго развіццём і працай на прафесійным і грамадскім полі (на польскай ці англійскай мове). Лісты павінны быць высланыя непасрэдна ў Камісію Фулбрайта асобамі, што рэкамендуюць кандыдатаў; копія дыплому (ці копія дыплома кандыдата навук).

Для ўдзельнікаў праграмы прадугледжана стыпендыя эквівалентам $500. Таксама аплочваюцца універсітэцкія выдаткі, пражыванне ў Польшчы, страхоўка, праезд у і з Польшчы, закупка навуковых матэрыялаў. Прадастаўляецца кампутар і прынтар.

Апошні тэрмін дасылання заяваў - 17 сакавіка 2002 г. Арыгіналы дакумантаў трэба выслаць поштай **па адрасе:** Polsko-Amerykanska Komisja Fulbrighta, ul. Nowy Swiat 4, 00-497 Warszawa - Polska. Таксама магчыма даслаць копіі дакументаў на e-mail: fulbright@fulbright.edu.pl ці u.moczydlowska@fulbright.edu.pl

Фармуляры для заяваў і інфармацыйныя матэрыялы магчыма замовіць поштай, па тэлефоне ці e-mail у Польска-Амерыканскай камісіі Фулбрайта па нумарах: tel. (48-22) 628-7950; 625-6932; 625-6978. Матэрыялы таксама знаходзяцца на старонцы Камісіі Фулбрайта па адрасе: http://www.fulbright.edu.pl.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# У ЛУНИНЕЧЧИНЫ ЕСТЬ БУДУЩЕЕ

ВЕЛИКИЕ УМЫ ПРОШЛОГО ПРЕДВИДЕЛИ ПОСЛЕДСТВИЯ БЕЗУМНОГО ПОКОРЕНИЯ ЧЕЛОВЕКОМ ПРИРОДЫ. ОНИ ПРЕДУПРЕЖДАЛИ: РОД ЧЕЛОВЕЧЕСКИЙ МОЖЕТ НАУЧИТЬ СЕБЯ ИСТРЕБЛЯТЬ РАСТИТЕЛЬНЫЙ И ЖИВОТНЫЙ МИР, ОТРАВЛЯЯ ВОДУ, ЗЕМЛЮ, ВОЗДУХ. СЕГОДНЯ НАСТУПИЛ КРИЗИС В ОТНОШЕНИЯХ МЕЖДУ ЧЕЛОВЕКОМ И ПРИРОДОЙ.

***Можно только поражаться тому, с какой катастрофической скоростью человек научился умерщвлять природу! Еще вчера мы и не подозревали, что мир так изменится, что Земля уже далеко не цветущий сад! Еще совсем недавно спокойно охотились, ловили рыбу, собирали охапки лесных цветов, грибы, ягоды… Еще совсем недавно дым из каменной трубы мог в худшем случае испачкать белье, висящее на веревке в палисаднике соседа. Сегодня дым из труб достигает соседних стран и грозит уже загрязнить ни много, ни мало – землю целого государства… Еще вчера мы всерьез не задумывались, хватит ли будущим поколениям чистой воды и чистого воздуха… Еще вчера… И сегодня…***

Молодежный центр «Будущее Лунинеччины» пытается внести практический вклад в улучшение экологической обстановки в Лунинецком районе и проводит экологическое воспитание молодежи. Ребятами проводятся научные исследования по изучению природы района. Объект исследования уникален сочетанием растительных сообществ. В районе можно наблюдать двухъярусный сосняк, представленный в Беларуси только в Беловежской пуще, грабовый лес, суходольный и пойменный луга, смешанные леса и березовые рощи.

Изучается флора района, проводится сбор гербарных материалов. Если количество травянистых растений, как наиболее устойчивых, было приблизительно 10-20 видов на 100м$^2$, то количество мхов и лишайников является неравномерным в силу их индикационных свойств. Это говорит о загрязнении почвы и воздуха. За 5 лет работы проекта, проводимого центром “Будущее Лунинеччины”, шёл мониторинг видов на пробных площадках. За это время с изучаемой территории пропала гвоздика картезианская, сократилось количество почвообразователей, что ведет к необратимым процессам истощения и гибели земель после пожаров, прекращению процесса усвоения неорганического субстрата.

Организация проводит изучение вод в природных и искусственных водоемах, а также источниках питьевого водоснабжения. В ходе исследований выяснилось, что вода в природном, отдаленном от населенных пунктов озере чище, чем питьевая. Но загрязнение промышленными отходами – не единственная проблема нашей страны. Чернобыльская авария оказала влияние на природу и хозяйственную деятельность человека в Беларуси. Лунинецкий район относится к загрязненным, поэтому важным для целостного представления о состоянии нашей природы явилось изучение содержания радионуклидов в лекарственных растениях, грибах. Центр выяснил, что не подлежит сбору около 40% лекарственного сырья, а также большое количество ягод и грибов в районе.



**Свалка мусора в Барановичском р-не.** **Фото: «Живая земля»**

Ежегодно центр «Будущее Лунинеччины» проводит акции под названием «Нет насилию над природой». Ребята убирают мусор в лесу, огораживают муравейники, мастерят и размещают домики для птиц. На организованной своими усилиями экологической тропе проводят экскурсии для школьников и обучают правилам поведения в лесу. Группа лекторов молодёжного центра совместно с медицинскими работниками ведет разъяснительную работу среди населения по пропаганде рационального использования лекарственного сырья, грибов и ягод на территории, загрязнённой радионуклидами.

В форме театрализованного представления волонтёры организации пытаются донести до детей губительный характер глобальных экологических проблем и их последствий, приобщить их к борьбе за сохранение природы. Ведь чтобы ее сохранить, необходимо изменить свое отношение к ней, изменить общественную мысль в отношении окружающей природы.

В молодёжном центре «Будущее Лунинеччины» разработан проект по озеленению и благоустройству территории, прилегающей к городскому лицею. На площади 30 га произрастают фруктовые деревья, берёзовая роща, разбиты цветники. Совместно с коммунальными службами центр участвует в озеленении города.

По словам руководителя молодёжного центра «Будущее Лунинеччины» Татьяны Козловой, активисты организации надеются, что своей работой они вносят пусть маленький, но свой личный вклад в сохранении родной земли, и им не будет стыдно перед последующими поколениями в том, что они были пассивными наблюдателями гибели Земли.

Чтобы себя и мир спасти
Нам нужно, не теряя годы,
Забыть все культы и ввести
Ненарушимый культ природы.

**Dzedzich week-news**

## ДАРЭЧЫ

Ідзе іспыт па фізіцы. Выкладчык кажа студэнту:
- Назавіце мне ўсе дыэлектрычныя элементы.
Студэнт пералічвае.
- Вы запамятавалі назвать яшчэ адзін.
Студэнт думае, думае і кажа:
- Не ведаю.
- Ну як так. Успамінайце! Ну добра, я вам падкажу. Калі Вы ідзеце з дзяўчынкай па вуліцы і заходзіце ў цёмны пад'езд, чым вы займаецеся?
- А, эбаніт!
- Ды не эбаніт, а цэлулоід.

***

Медыцына. Пачатак лекцыі. Заходзіць выкладчык.
- Перад пачаткам лекцыі я хацеў бы распавесці вам адну гісторыю. Калісьці ў маладосці я з сябрам пайшоў на дыскатэку. І там нам абодвум спадабалася адна прываблівая дзяўчына. Але яна аддала перавагу майму сябру і пасля дыскатэкі пайшла з ім. Вось так я застаўся з носам. А мой сябар без носа. Запішыце тэму лекцыі: "Сіфіліс і яго наступствы".

***

Іспыт па філасофіі. Выкладчык кажа:
- Хто зможа задаць мне тры пытанні, на якія я не здолею адказаць, таму пастаўлю пяць за іспыт!
Устае студэнт і кажа:
- 1. Што ў вашым жыцці законна, але не лагічна?
- 2. Што ў вашым жыцці лагічна, але не законна?
- 3. Што ў вашым жыцці не законна і не лагічна?
Выкладчык доўга думае, але адказаць не здолеў. Ставіць студэнту "5" у залікоўку і адпраўляе дахаты.
- А зараз хто адкажа на гэтыя тры пытанні, ад таго я адчаплюся на увесь перыяд навучання!
Устае другі студэнт і кажа:
- 1. Вось вы стары чалавек, але жонка ў вас маладая. ЗАКОННА, АЛЕ НЕЛАГІЧНА.
- 2. У вашай жонкі ёсць малады палюбоўнік. НЕЗАКОННА, АЛЕ ЛАГІЧНА.
- 3. І вы гэтаму маладому палюбоўніку паставілі зараз пяцёрку проста так.

№ 1 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
люты 2002

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ
Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

СКЛАДАЕМ ПАДЗЯКУ ГА “Брэсцкі абласны цэнтр падтрымкі грамадзянскіх ініцыятыў “ВЕЖА” ЗА АКАЗАНУЮ ДАПАМОГУ

**Заснавальнік** - Ініцыятыўная група моладзі

**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк** 10.02.2002 года ў 18-00
**Наклад** 299 асобнікаў.

**Галоўны рэдактар:** Д.Шыманскі
**Рэдакцыйная калегія:** Я.Берасцейская, Д.Раманоўская, А. Дземідзюк

**Кантактны тэлефон:** (0162) 26-15-51
**E-mail:** dzedzich@mail.ru